Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі»

Кафедра гуманітарных дысцыплін

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ
Вучэбна-метадычныя матэрыялы

Пад рэдакцыяй прафесара Я. К. Новіка

Мінск БДУІР 2011

Библиотека БГУИР

УДК 94(476)(076)
ББК 63.3(4Беи)я73
Г51

Абмеркаваны і зацверджаны на пасяджэнні кафедры гуманітарных дысцыплін БДУІР 23 лютага 2011 г., пратакол № 7.

С к л а д а л ь н і к і:
Я. К. Новік – доктар гістарычных навук, прафесар
Л. В. Мікалаева – кандыдат гістарычных навук, дацэнт
В. У. Лютава – кандыдат гістарычных навук, дацэнт
І. Л. Качалаў – кандыдат гістарычных навук, дацэнт
У. Я. Парфянкоў – кандыдат гістарычных навук, дацэнт
Н. І. Куракевіч – кандыдат гістарычных навук, дацэнт
Я. І. Бараноўскі – кандыдат гістарычных навук, дацэнт
Ю. І. Літвіноўская – кандыдат гістарычных навук, дацэнт
Г. У. Мякінькая – выкладчык

Р э ц э н з е н т:
дацэнт кафедры сацыяльнай работы філіяла Расійскага дзяржаўнага сацыяльнага ўніверсітэта ў г. Мінску кандыдат гістарычных навук В. І. Яршова

Г51 **Гісторыя** Беларусі : вучэб.-метад. матэрыялы / склад. Я. К. Новік [і інш.], пад рэд. Я. К. Новіка. – Мінск : БДУІР, 2011. – 122 с.
ISBN 978–985–488–808–8.

Вучэбна-метадычныя матэрыялы падрыхтаваны на аснове Тыпавой вучэбнай праграмы для вышэйшых навучальных устаноў па дысцыпліне «Гісторыя Беларусі», зацверджанай Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь 15 красавіка 2008 г., рэгістрацыйны № ТД-СТ.009/тып. Утрымліваюць рабочую праграму, тэматыку і змест семінарскіх заняткаў, заданні для самастойнай работы студэнтаў, пералік пытанняў для падрыхтоўкі да экзамена, тэмы кантрольнай работы, спіс літаратуры, а таксама вучэбна-тэматычныя планы дысцыпліны.
Для студэнтаў усіх спецыяльнасцяў і ўсіх форм навучання БДУІР.

**УДК 94(476)(076)**
**ББК 63.3(4Беи)я73**

**ISBN 978–985–488–808–8**

© УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі», 2011

Библиотека БГУИР

ЗМЕСТ

1. Тлумачальная запіска…………………………………………............ 4
2. Вучэбна-тэматычныя планы………………………………………….. 6
3. Змест дысцыпліны «Гісторыя Беларусі»………………….………... 9
4. Тэматыка і змест семінарскіх заняткаў……………..................... 28
4.1. Планы семінарскіх заняткаў па дысцыпліне «Гісторыя Беларусі» для студэнтаў дзённай формы навучання………………………………… 28
4.2. Планы семінарскіх заняткаў па дысцыпліне «Гісторыя Беларусі» для студэнтаў вячэрняй формы навучання……………………….. 78
4.3. Планы семінарскіх заняткаў па дысцыпліне «Гісторыя Беларусі» для студэнтаў завочнай формы навучання……………………….. 83
5. Метадычныя рэкамендацыі да выканання кантрольнай работы (завочная і дыстанцыйная формы навучання)………………………. 85
6. Тэмы кантрольнай работы…………………………………………... 87
7. Літаратура……………………………………………………………... 115
8. Пытанні для падрыхтоўкі да экзамена……………………………… 119

Библиотека БГУИР

# 1. Тлумачальная запіска

**Мэта выкладання дысцыпліны** – навучыць студэнтаў з навуковых, аб'ектыўных пазіцый аналізаваць гістарычныя факты, падзеі, з'явы, выхоўваць павагу і любоў да сваёй Айчыны, яе гісторыі; фарміраваць сацыяльна-культурныя кампетэнцыі, якія забяспечваюць самавызначэнне студэнтаў у сістэме каштоўнасцей, выпрацаваных у працэсе гістарычнага развіцця беларускага народа і станаўлення суверэннай беларускай дзяржавы, выхаваць на гэтай аснове пачуццё прыналежнасці да лёсу краіны і яе гісторыі.

**Задачы вывучэння дысцыпліны.** Для рэалізацыі пазначанай мэты прадугледжваецца вырашэнне наступных задач:

– засваенне і выкарыстанне вучэбнай гістарычнай інфармацыі, звязанай з аналізам заканамернасцей і асаблівасцей дзяржаўна-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, канфесійнага, культурнага і духоўнага развіцця беларускага народа і фарміраванне на гэтай аснове здольнасці да самарэалізацыі ва ўмовах сучаснай соцыякультурнай сітуацыі;

– усведамленне студэнтамі сістэмы матэрыяльных, культурных і духоўных каштоўнасцей беларускага народа, якія служаць падмуркам для аналізу сучаснасці і вызначэння перспектыў будучай жыццядзейнасці;

– фарміраванне выпускніка вышэйшай школы як грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, здольнага спрыяць далейшаму развіццю сваёй краіны.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен:

**ведаць:**

– асноўныя тэорыі грамадскага развіцця, асаблівасці фармацыйнага і цывілізацыйнага падыходаў да вывучэння гісторыі Беларусі;

– этапы фарміравання беларускага народа ў розныя гістарычныя перыяды;

– гістарычныя мадэлі мадэрнізацыі грамадства і дзяржавы, савецкі вопыт мадэрнізацыі і цывілізацыйнага развіцця беларускага грамадства;

– культурна-гістарычную спадчыну беларускага народа, дасягненні ў развіцці матэрыяльнай і духоўнай культуры;

– этапы станаўлення розных форм дзяржаўнасці на тэрыторыі Беларусі, беларускай дзяржаўнасці і дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь;

– месца і ролю беларускіх зямель у геапалітычных працэсах у розныя гістарычныя перыяды, уклад беларускага народа ў Перамогу над фашызмам, значэнне і месца суверэннай Рэспублікі Беларусь у сучасным свеце;

**умець:**

– прымяняць фармацыйны і цывілізацыйны падыходы да вывучэння гісторыі пры характарыстыцы асаблівасцей гістарычнага развіцця беларускага народа;

– характарызаваць умовы і вынікі фарміравання беларускага народа ў розныя гістарычныя перыяды;

– ажыццяўляць параўнальны аналіз рэформ і рэвалюцый у працэсе мадэрнізацыі беларускага грамадства, ацэньваць вынікі дзейнасці савецкай

Библиотека БГУИР

грамадска-палітычнай сістэмы ў БССР, вызначаць сутнасныя характарыстыкі беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця;

– тлумачыць уплыў розных культурна-цывілізацыйных фактараў на развіццё Беларусі і ацэньваць асноўныя дасягненні ў развіцці матэрыяльнай і духоўнай культуры, выкарыстоўваць культурна-гістарычную спадчыну ў сваёй прафесійнай дзейнасці і ўзбагачаць яе;

– аналізаваць працэс станаўлення беларускай дзяржаўнасці, афармлення і ўмацавання суверэнітэту Рэспублікі Беларусь;

– характарызаваць геапалітычнае становішча беларускіх зямель у розныя гістарычныя перыяды, ацэньваць значэнне Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, аналізаваць месца і ролю суверэннай Рэспублікі Беларусь ва ўмовах глабалізацыі сусветных працэсаў.

**Пералік дысцыплін, засваенне якіх неабходна для вывучэння дысцыпліны «Гісторыя Беларусі».**

Дадзеная дысцыпліна не патрабуе ўзгаднення з іншымі дысцыплінамі.

Библиотека БГУИР

## 2. Вучэбна-тэматычныя планы

| Назва тэмы | Дзённая форма навучання, аб’ём, гадзін | | | | Вячэрняя форма навучання, аб’ём, гадзін. | | | | Завочная форма навучання, аб’ём, гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Усяго | Лекцыі | Семінарскія (практычныя) заняткі | Самастойная работа студэнтаў | Усяго | Лекцыі | Семінарскія (практычныя) заняткі | Самастойная работа студэнтаў | Усяго | Лекцыі | Семінарскія (практычныя) заняткі | Самастойная работа студэнтаў |
| Уводзіны | 1 | 1 | - | - | 1 | 1 | - | - | 2 | - | 2 | - |
| 1. Старажытнае грамадства на тэрыторыі Беларусі. Фарміраванне этнічных супольнасцей. Станаўленне і развіццё феадальных адносін (ад старажытных часоў – да другой паловы XIII ст.) | 16 | 4 | 4 | 8 | 16 | 2 | 2 | 12 | 16 | 2 | 2 | 12 |
| 2. Беларускія землі ў складзе Вялікага Княства Літоўскага: Ад Сярэднявечча – да Новага часу (другая палова XIII – першая палова XVI ст.) | 16 | 4 | 4 | 8 | 16 | 2 | 2 | 12 | 16 | 1 | - | 15 |
| 3. Беларусь у складзе Рэчы Паспалітай: Пачатак Новага часу ў айчыннай гісторыі (1569–1795 гг.) | 16 | 4 | 4 | 8 | 16 | 2 | 2 | 12 | 16 | 1 | - | 15 |
| 4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (1795 – люты 1917 г.) | 24 | 6 | 4 | 14 | 24 | 2 | 2 | 20 | 22 | - | 2 | 20 |

Библиотека БГУИР

| Назва тэмы | Дзённая форма навучання, аб’ём, гадзін | | | | Вячэрняя форма навучання, аб’ём, гадзін | | | | Завочная форма навучання, аб’ём, гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Усяго | Лекцыі | Семінарскія (практычныя) заняткі | Самастойная работа студэнтаў | Усяго | Лекцыі | Семінарскія (практычныя) заняткі | Самастойная работа студэнтаў | Усяго | Лекцыі | Семінарскія (практычныя) заняткі | Самастойная работа студэнтаў |
| 5. Кастрычніцкая рэвалюцыя ў Беларусі. Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва. Грамадзянская вайна і іншаземная інтэрвенцыя: Пачатак Найноўшага часу ў айчыннай гісторыі (люты 1917 – 1920 г.) | 16 | 4 | 4 | 8 | 16 | 2 | 2 | 12 | 16 | - | 2 | 14 |
| 6. Савецкая Беларусь ва ўмовах новай эканамічнай палітыкі і пабудовы сацыялізму: савецкая мадэль мадэрнізацыі. Заходняя Беларусь пад уладай Польшчы (1921 – 1939 гг.) | 16 | 4 | 4 | 8 | 16 | 2 | 2 | 12 | 16 | 1 | - | 15 |
| 7. Беларусь у гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны (верасень 1939 г. – верасень 1945 г.) | Выключана з курса «Гісторыя Беларусі» ў сувязі з увядзеннем з 2010 – 2011 навучальнага года новай дысцыпліны «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)» | | | | | | | | | | | |

Библиотека БГУИР

| Назва тэмы | Дзённая форма навучання, аб'ём, гадзін | | | | Вячэрняя форма навучання, аб'ём, гадзін | | | | Завочная форма навучання, аб'ём, гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Усяго | Лекцыі | Семінарскія (практычныя) заняткі | Самастойная работа студэнтаў | Усяго | Лекцыі | Семінарскія (практычныя) заняткі | Самастойная работа студэнтаў | Усяго | Лекцыі | Семінарскія (практычныя) заняткі | Самастойная работа студэнтаў |
| 8. Сацыяльна-эканамічнае, палі-тычнае і культур-нае развіццё Беларускай ССР. Замежныя сувязі (1945 – 1990 гг.) | 16 | 3 | 4 | 9 | 16 | 2 | 2 | 12 | 16 | - | - | 16 |
| 9. Рэспубліка Беларусь на шляху станаўлення і ўмацавання дзяржаўнага суверэнітэту (1991 – 2011 гг.) | 16 | 3 | 4 | 9 | 16 | 2 | 2 | 12 | 16 | 1 | - | 15 |
| Заключэнне | 1 | 1 | - | - | 1 | 1 | - | - | 2 | - | - | 2 |
| УСЯГО, гадзін | 138 | 34 | 32 | 72 | 138 | 18 | 16 | 104 | 138 | 6 | 8 | 124 |

* Для дыстанцыйнай формы навучання прадугледжана толькі самастойная работа студэнтаў над вучэбным матэрыялам. Студэнты дыстанцыйнай формы навучання таксама выконваюць кантрольную работу па дысцыпліне «Гісторыя Беларусі».

Библиотека БГУИР

## 3. Змест дысцыпліны «Гісторыя Беларусі»

## УВОДЗІНЫ

**Прадмет і задачы гістарычнай навукі.** Месца і роля гістарычнай навукі ў сучасным грамадстве. Тэарэтыка-метадалагічныя асновы гісторыі Беларусі. Фармацыйны, цывілізацыйны і культуралагічны падыходы да вывучэння айчыннай гісторыі. Гісторыя Беларусі – састаўная частка еўрапейскай і сусветнай гісторыі.

**Перыядызацыя гісторыі Беларусі**: Старажытнае грамадства, Сярэднявечча, Новы час, Найноўшы час.

**Крыніцы па гісторыі Беларусі**: археалагічныя, этнаграфічныя, лінгвістычныя, вусныя, пісьмовыя, кіна-фота-фонадакументы.

**Гістарыяграфія гісторыі Беларусі.** Пачатак беларускай гістарыяграфіі. Заснавальнікі гістарычнага краязнаўства, беларускай археалогіі і фалькларыстыкі.

Уклад у распрацоўку беларускай гістарыяграфіі гісторыкаў, этнографаў і лінгвістаў І. Грыгаровіча, І. Насовіча, М. Дзмітрыева, Т. Нарбута, А. Кіркора, М. Федароўскага, Е. Раманава і інш. Распрацоўка гісторыі і этнаграфіі Беларусі ў працах М. Каяловіча, М. Доўнар-Запольскага і В. Ластоўскага. Навуковая спадчына ў галіне беларусазнаўства і беларускай славістыкі Я. Карскага.

Развіццё беларускай гістарыяграфіі ў 1917 – 1941 гг. Асаблівасці і асноўныя накірунакі развіцця беларускай гістарыяграфіі ў пасляваенны перыяд. Калектыўныя працы па гісторыі Беларусі, энцыклапедычныя выданні, вучэбныя дапаможнікі, апублікаваныя ў 1960 – 1980-я гады. Навуковая і вучэбная літаратура па гісторыі Беларусі, энцыклапедычныя і перыядычныя гістарычныя выданні на мяжы XX і XXI стст.

### ТЭМА I. СТАРАЖЫТНАЕ ГРАМАДСТВА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ. ФАРМІРАВАННЕ ЭТНІЧНЫХ СУПОЛЬНАСЦЕЙ. СТАНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ ФЕАДАЛЬНЫХ АДНОСІН (АД СТАРАЖЫТНЫХ ЧАСОЎ – ДА ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XIII ст.)

**Засяленне беларускіх зямель. Фарміраванне этнічных супольнасцей.** *Даіндаеўрапейскі перыяд этнічнай гісторыі Беларусі, яго храналагічныя рамкі.* Розныя пункты гледжання наконт часу з’яўлення людзей на сучаснай беларускай тэрыторыі. Першыя палеалітычныя стаянкі чалавека. Гаспадарка і ўмовы жыцця старажытнага насельніцтва ў палеаліце. Істотныя змены ў характары гаспадаркі і грамадскім жыцці насельніцтва ў мезаліце і неаліце. Пераход да вытворчай гаспадаркі – земляробства і жывёлагадоўлі. Неалітычная рэвалюцыя. Пачатак фарміравання на сучаснай тэрыторыі Беларусі этнічных груп. Паняцці «этнас», «этнічная тэрыторыя», «этнічная супольнасць». Характэрныя прыкметы этнасу.

Бібліотека БГУИР

*Індаеўрапейскі перыяд этнічнай гісторыі Беларусі, яго храналагічныя рамкі.* Паходжанне індаеўрапейцаў, прычыны, час і шляхі іх міграцыі: розныя канцэпцыі. Змены ў сацыяльна-эканамічным развіцці беларускіх зямель з рассяленнем на іх індаеўрапейцаў. Фіна-угорская міграцыя ў Еўразіі. Фіна-угорская тапаніміка на тэрыторыі Беларусі.

*Балцкі этап этнічнай гісторыі Беларусі, яго храналагічныя рамкі.* Далейшая міграцыя індаеўрапейцаў. Балты, германцы, славяне. Дыферэнцыяцыя балтаў у выніку іх рассялення. Гаспадарка і культура балтаў.

*Славянскі этап этнічнай гісторыі Беларусі, яго храналагічныя рамкі.* Паходжанне славян: розныя канцэпцыі. Прычыны славянскай міграцыі, яе асноўныя шляхі. Тры галіны славян: паўднёвыя, заходнія і ўсходнія. Засяленне славянамі тэрыторыі Беларусі.

Этнічныя славянскія супольнасці на землях сучаснай Беларусі: дрыгавічы, радзімічы, крывічы. Заняткі, прылады працы, грамадскі лад, тэрытарыяльная абшчына. Матэрыяльная і духоўная культура. Асіміляцыйныя працэсы паміж славянскімі супольнасцямі (дрыгавічоў, радзімічаў і крывічоў) і фіна-угорскімі, усходнебалцкімі (літоўскімі), заходнебалцкімі (яцвяжскімі) і заходнеславянскімі (мазавецкімі) плямёнамі.

**Узнікненне Беларусі і беларускага этнасу: розныя падыходы і канцэпцыі. Паходжанне назваў «Белая Русь», «Чорная Русь».** Сутнасць велікарускай і польскай канцэпцый паходжання беларусаў. Крывіцкая і крывіцка-дрыгавіцка-радзіміцкая канцэпцыі. Фінская канцэпцыя. Балцкая тэорыя этнагенезу беларусаў археолага В. Сядова. Канцэпцыя этнографа С. Токарава. Погляды М. Ермаловіча наконт паходжання беларусаў. Канцэпцыя гісторыка-этнографа М. Піліпенкі. Паходжанне тэрмінаў «Белая Русь», «Чорная Русь»: розныя версіі.

**Старажытнаруская дзяржава (Кіеўская Русь) – агульная раннефеадальная дзяржава ўсходніх славян. Палітычнае і эканамічнае становішча беларускіх зямель.** Прычыны і працэс утварэння Кіеўскай Русі. Розныя канцэпцыі паходжання Старажытнарускай дзяржавы. Паходжанне назвы «Русь». Кіеўская Русь – раннефеадальная дзяржава-манархія (862 – 1125 гг.), асаблівасці яе палітычнага ладу. Барацьба кіеўскіх князёў за ўзмацненне свайго ўплыву на беларускіх землях.

*Полацкае і Тураўскае княствы – першыя раннефеадальныя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі.* Полацкае княства – адно з буйнейшых дзяржаўных феадальных утварэнняў. Палітычны лад, веча ў Полацкім княстве. Барацьба полацкіх князёў за самастойнасць. Княжанне Рагвалода, Брачыслава Ізяславіча і Усяслава Брачыславіча. Тураўскае княства.

*Беларускія землі ў перыяд феадальнай раздробленасці. Феадальнае землеўладанне і гаспадарка.* Прычыны распаду ў пачатку XII ст. Старажытнарускай дзяржавы на асобныя княствы. Беларускія землі ў перыяд феадальнай раздробленасці. Мінскае княства. Спробы аб'яднаць Мінскае і Полацкае княствы. Узвышэнне Навагародскай зямлі. Зближэнне і сумесная барацьба Навагародскага і Турава-Пінскага княстваў супраць галіцка-валынскіх



Библиотека БГУИР

князёў. Феадальная раздробленасць – вынік феадальнага ладу вытворчасці, заканамерны этап гістарычнага развіцця. Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у XII – XIII стст.

**Барацьба супраць крыжакоў і татара-манголаў.** Прычыны і мэты стварэння крыжацкіх ордэнаў. Замацаванне крыжакоў у Прыбалтыцы. Барацьба полацкага князя Уладзіміра з крыжакамі. Саюз Полацка і Ноўгарада супраць крыжакоў. Перамога Аляксандра Неўскага над нямецкімі рыцарамі на Чудскім возеры.

Барацьба рускіх княстваў супраць татара-манголаў. Бітва на р. Калцы. Татара-мангольскія нашэсці на землі Русі. Татара-мангольскае ярмо на Русі (1240 – 1480 гг.).

**Увядзенне хрысціянства. Культура на беларускіх землях у IX – XIII стст.** Паходжанне хрысціянства. Уплыў Візантыі на культурнае і духоўнае развіццё ўсходніх славян. Язычніцтва славян. Хрышчэнне Русі. Распаўсюджанне хрысціянства ў Полацкай і іншых беларускіх землях. Значэнне хрысціянства для духоўнага развіцця грамадства. Хрысціянства і пісьменства ў Беларусі.

Матэрыяльная і духоўная культура Полацкай зямлі. Манументальная архітэктура. Абарончыя збудаванні. Полацкі Сафійскі сабор. Фрэскавы жывапіс. Вусная народная творчасць. Пісьменства. Летапісы. Вядомыя дзеячы асветы: Ефрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Клімент Смаляціч. Прыкладное мастацтва. Крыж Ефрасінні Полацкай. Культура беларускіх зямель у IX – XIII стст. у кантэксце еўрапейскага культурнага працэсу.

## ТЭМА II. БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў СКЛАДЗЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА: АД СЯРЭДНЯВЕЧЧА – ДА НОВАГА ЧАСУ (ДРУГАЯ ПАЛОВА XIII – ПЕРШАЯ ПАЛОВА XVI ст.)

**Утварэнне Вялікага Княства Літоўскага: розныя тэарэтычныя падыходы і канцэпцыі.** Сацыяльна-эканамічныя, ўнутрыпалітычныя і знешнепалітычныя перадумовы фарміравання Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ). Асноўныя канцэпцыі ўтварэння ВКЛ: традыцыйная (літоўская), новая (беларуская), цэнтрысцкая – тэзісы, аргументы і факты ў іх абарону. Працэс утварэння ВКЛ. Шляхі ўваходжання беларускіх зямель у склад ВКЛ. Роля Міндоўга ў стварэнні новай дзяржавы. Барацьба за вялікакняжацкую ўладу пасля смерці Міндоўга. Аб'яднальныя працэсы ў час княжання Войшалка, Трайдзена, Віценя, Гедыміна, Альгерда і Вітаўта. ВКЛ – поліэтнічная дзяржава чатырох народаў (беларускага, украінскага, рускага і літоўскага).

**Беларускія землі ў грамадска-палітычным жыцці Вялікага Княства Літоўскага.** Статус беларускіх зямель пасля ўваходжання іх ў склад ВКЛ. Барацьба федэралісцкіх і цэнтралісцкіх тэндэнцый ва ўнутрыпалітычным жыцці дзяржавы. Палітычныя крызісы ў ВКЛ у 1341, 1377 і 1381 гг.

Крэўская унія. Пракаталіцкая палітыка Ягайлы. Грамадзянская вайна 1386 – 1392 гг. Востраўскае пагадненне. Княжанне Вітаўта і цэнтралізацыя



Библиотека БГУИР

дзяржавы. Замена сістэмы спадчыннага ўдзельнага княжання інстытутам намесніцтва. Гарадзельская унія. Спроба Вітаўта перапыніць васальныя адносіны з Каронай Польскай, дасягнуць поўнага суверэнітэту, аж да стварэння асобнага каралеўства. Грамадзянская вайна ў ВКЛ 1432 – 1436 гг. Абвяшчэнне вялікім князем Казіміра Ягайлавіча і незалежнасць ВКЛ ад Польшчы ў 1440 – 1447 гг. Спроба разарваць дынастычную унію ВКЛ з Польшчай у 1526 – 1529 гг.

**Асаблівасці дзяржаўнага ладу Вялікага Княства Літоўскага. Тры Статуты ВКЛ.** Адрозненне дзяржаўнага ладу ВКЛ ад дзяржаўнага ладу Вялікага Княства Маскоўскага. Удзельная сістэма і сістэма намесніцтваў. Спадчынная, неабмежаваная манархія і абмежаваная, канстытуцыйная манархія. Выбарнасць велікакняжацкай улады ў ВКЛ у выніку уніі з Польшчай. Велікакняжацкая Дума, яе трансфармацыя ў Раду паноў (паны-рада). Склад рады і яе функцыі. Вальны сейм, яго склад і функцыі. Органы мясцовага кіравання. Судзебнік 1468 г. Тры Статуты ВКЛ. Судовая сістэма ВКЛ.

**Асноўныя напрамкі знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага.** Барацьба ВКЛ з татара-манголамі. Бітвы на р. Сінія Воды і р. Ворскла. Узаемаадносіны ВКЛ з Крымскім ханствам.

Барацьба супраць крыжацкіх ордэнаў. Гістарычнае значэнне разгрому крыжакоў пад Грунвальдам.

Прычыны абвастрэння адносін паміж ВКЛ і Вялікім Княствам Маскоўскім з канца XV ст. Маскоўска-літоўскія войны, іх вынікі і наступствы.

**Эканамічнае развіццё беларускіх зямель. Станаўленне фальваранчна-паншчыннай гаспадаркі і масавае запрыгоньванне сялян. Беларускі феадальны горад.** Формы ўласнасці на зямлю. Феадальны клас зямельных уласнікаў. Асноўныя катэгорыі феадальна залежнага сялянства. Формы феадальнай рэнты: адработачная, грашовая і прадуктовая. Дадатковыя павіннасці сялян: талокі, гвалты (згоны). Аграрная рэформа 1557 г. у ВКЛ – «валочная памера», яе прычыны і сутнасць. Завяршэнне працэсу запрыгоньвання сялян. Юрыдычнае афармленне прыгоннага права. Стварэнне фальварачна-паншчыннай гаспадаркі.

Рост гарадоў і мястэчак. Фарміраванне саслоўя мяшчан. Магдэбургскае права і сістэма гарадскога самакіравання. Развіццё рамяства і гандлю. Саюзы (брацтвы) купцоў і цэхі рамеснікаў. Унутраны і знешні гандаль.

**Фарміраванне беларускай народнасці.** Вызначэнне народнасці, яе асноўныя прыкметы. Фактары ўтварэння беларускай народнасці: палітычныя, эканамічныя, сацыяльныя, канфесійныя. Працэс фарміравання беларускай народнасці. Агульная этнічная тэрыторыя і агульная мова. Матэрыяльная і духоўная культура. Этнічная самасвядомасць і саманазва.

**Культура Беларусі ў другой палове XIII – першай палове XVI ст.** Асаблівасці развіцця культуры на беларускіх землях. Станаўленне старабеларускай мовы, развіццё літаратуры, летапісання. Беларуска-літоўскія летапісы.

Библиотека БГУИР

Пачатак Адраджэння на беларускіх землях. Узнікненне кнігадрукавання. Ф. Скарына і М. Гусоўскі.

Архітэктура і выяўленчае мастацтва. Готыка на беларускіх землях. Беларусь Сярэднявечча – краіна замкаў. Культавае дойлідства. Абарончыя храмы. Выяўленчае мастацтва – іканапіс, фрэскі, кніжная мініяцюра, гравюра, арнамент, драўляная разьбяная скульптура. Выраб кафлі на Беларусі.

## ТЭМА III. БЕЛАРУСЬ У СКЛАДЗЕ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ: ПАЧАТАК НОВАГА ЧАСУ У АЙЧЫННАЙ ГІСТОРЫІ (1569 – 1795 гг.)

**Люблінская унія. Утварэнне Рэчы Паспалітай.** Прычыны ўтварэння Рэчы Паспалітай: знешнепалітычныя, унутрыпалітычныя і дынастычныя. Люблінскі сейм. Пазіцыі польскай і літоўскай арыстакратыі па пытанні уніі. Падпісанне Люблінскай уніі і яе змест.

**Грамадска-палітычны лад Рэчы Паспалітай. Дзяржаўна-прававое становішча Вялікага Княства Літоўскага ў складзе Рэчы Паспалітай.** Рэч Паспалітая – канстытуцыйная, саслоўная манархія на чале з выбарным каралём. «Залатыя шляхецкія вольнасці»: права «liberum veto», дагаворы «Pacta conventa» і «Генрыхавы артыкулы», канфедэрацыі і «рокашы».

Дзяржаўна-прававое становішча ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай. Розныя пункты гледжання на характар дзяржаўнасці Рэчы Паспалітай. Органы ўлады і кіравання ў ВКЛ, адасобленасць фінансаў, войска, судовай сістэмы, заканадаўства. Паступовая паланізацыя феадалаў ВКЛ.

**Барацьба беларускага народа супраць польска-каталіцкай экспансіі.** Складанасць рэлігійных адносін. Рэфармацыйны рух на Беларусі. Контррэфармацыя. Брэсцкі царкоўны сабор 1596 г., утварэнне уніяцкай царквы. Розныя пункты гледжання на ролю і характар дзейнасці уніяцкай царквы. Замойскі сабор 1720 г.

**Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у складзе Рэчы Паспалітай.** Саслоўі ў Беларусі: шляхта, сяляне, мяшчане, духавенства. Групоўкі ў шляхецкім саслоўі: буйныя магнаты (паны і князі), сярэдняя шляхта, дробная шляхта, пешая шляхта. Правядзенне аграрнай рэформы 1557 г. і яе вынікі. Катэгорыі сялян: цяглыя, асадныя, слугі, агароднікі, халупнікі, кутнікі (каморнікі). Змены ў катэгорыях сялян у выніку аграрнай рэформы.

Эканамічны заняпад Беларусі і яго прычыны. Рост прыгонніцкай эксплуатацыі сялян. Парасткі капіталізму. Вотчынныя мануфактуры.

Асаблівасці развіцця беларускага горада. Рамёствы і гандаль. Юрыдыкі. Цэхі. Унутраны і знешні гандаль. Развіццё шляхоў зносін.

**Знешняя палітыка. Войны другой паловы XVI – XVIII ст.** Лівонская вайна. Мэты ВКЛ у вайне. Ход ваенных дзеянняў. Наступленне войск Стэфана Баторыя і перанясенне баявых дзеянняў на ўласна рускую тэрыторыю. Ям-Запольскае перамір’е. Вынікі Лівонскай вайны.

Библиотека БГУИР

«Смутны час» у Рускай дзяржаве ў пачатку XVII ст. Лжэдзмітрый І (Г. Атрэп'еў) і Лжэдзмітрый ІІ (М. Малчанаў). Інтэрвенцыя Рэчы Паспалітай супраць Расіі ў 1609 г. і аблога Смаленска. Абвяшчэнне рускім царом польскага каралевіча Уладзіслава. Падзенне Смаленска. Вызваленне Масквы народным апалчэннем у кастрычніку 1612 г. Земскі сабор 1613 г. і выбранне царом М. Раманава. Дзеўлінскі дагавор і яго вынікі.

Смаленская вайна. Паляноўскі мірны дагавор і яго вынікі.

Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай у 1654 – 1667 гг. Прычыны поспеху рускіх войскаў у кампаніі 1654 г. Пачатак вайны Швецыі з Польшчай. Аб'яўленне рускім царом вайны Швецыі. Смерць Б. Хмяльніцкага і прыход да ўлады на Украіне прыхільнікаў Рэчы Паспалітай. Наступленне войскаў Рэчы Паспалітай. Андрусаўскае перамір'е. «Вечны мір» 1686 г.

Паўночная вайна. Саюз Даніі, Расіі, Саксоніі і Рэчы Паспалітай супраць Швецыі. Пачатак вайны. Выхад з вайны Даніі. Уступленне ў вайну Расіі. Палітычны крызіс у Рэчы Паспалітай. Альтранштацкі мір. Бітва ля в. Лясная. Палтаўская бітва. Ніштадскі мір. Спусташэнне Беларусі ў час вайны.

**Паглыбленне палітычнага крызісу. Тры падзелы Рэчы Паспалітай. Далучэнне Беларусі да Расійскай імперыі.** Прычыны палітычнага крызісу, яго праявы. Першая спроба рэформ дзяржаўнага ладу. Канфедэратыўны рух.

Першы падзел Рэчы Паспалітай. Новыя спробы рэформ. Прыняцце сеймам 3 мая 1791 г. Канстытуцыі Рэчы Паспалітай. Таргавіцкая канфедэрацыя і пачатак грамадзянскай вайны. Другі падзел Рэчы Паспалітай.

Паўстанне на чале з Т. Касцюшкам. Ход паўстання і яго ўдзельнікі. Бітва пад Мацяёвіцамі і паражэнне паўстання.

Трэці падзел Рэчы Паспалітай. Знішчэнне Рэчы Паспалітай як дзяржавы. Гісторыка-прававая ацэнка падзелаў Рэчы Паспалітай.

**Культура Беларусі ў другой палове XVI – канцы XVIII ст.** Канец эпохі Адраджэння. Сістэма школьнай адукацыі. Кнігадрукаванне. Эпоха Асветніцтва. Пашырэнне свецкай адукацыі ў XVIII ст. Дзейнасць Адукацыйнай камісіі. Бібліятэчная і архіўная справа.

З'яўленне свецкай літаратуры, яе новыя віды і жанры: публіцыстыка, гісторыка-мемуарная літаратура, палітычная сатыра, паэзія. С. Будны, В. Цяпінскі, Л. Карповіч, А. Філіповіч, М. Сматрыцкі. Палітычная сатыра. Беларускі верш. С. Полацкі.

Тэатр і музыка. Школьны тэатр. Тэатр лялек. Прыгонны тэатр. Свецкая і царкоўная музыка. Выяўленчае мастацтва. Беларускі іканапіс. Манументальны жывапіс. Партрэт.

Архітэктура. Стыль барока. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

## ТЭМА IV. БЕЛАРУСЬ У СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ (1795 – ЛЮТЫ 1917 г.)

**Уваходжанне Беларусі ў склад Расійскай імперыі. Палітычнае і сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель.** *Сацыяльна-палітычнае*



Библиотека БГУИР

*становішча беларускіх губерняў у канцы XVIII – першай чвэрці XIX ст.* Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел. Палітыка расійскага ўрада на беларускіх землях у канцы XVIII ст. Органы кіравання і суд. Канфесійная і нацыянальная палітыка. «Мяжа яўрэйскай аселасці». Сацыяльная структура насельніцтва беларускіх губерняў. Сацыяльна-эканамічнае становішча сялян. Саслоўная палітыка расійскага ўрада. Дваранская зямельная ўласнасць, яе асаблівасці на беларускіх землях. Адносіны расійскіх улад да мясцовай шляхты. Заканадаўчая палітыка ў Беларусі. Польскае пытанне ва ўрадавай палітыцы Расіі.

*Беларусь у Айчыннай вайне 1812 г.* Міжнароднае становішча ў Еўропе напярэдадні вайны. Падрыхтоўка Расіі да вайны і сацыяльна-палітычная сітуацыя ў заходніх губернях. Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі летам 1812 г. Акупацыйны рэжым французскіх улад. Адносіны розных пластоў насельніцтва да падзей вайны 1812 г. Ваенныя дзеянні ў Беларусі восенню 1812 г. Вынікі вайны для Беларусі. Палітыка царызму на Беларусі пасля 1812 г.

*Рэвалюцыйны і нацыянальна-вызваленчы рух у першай палове XIX ст.* Грамадска-палітычны рух у Беларусі ў першыя дзесяцігоддзі XIX ст. Польскія і расійскія дваранскія рэвалюцыянеры ў Беларусі. Тайныя таварыствы. Паўстанне 1830 – 1831 гг. «Дэмакратычнае таварыства». «Саюз свабодных братоў».

*Змены ва ўрадавай палітыцы ў Беларусі ў 1830 – 1850-я гг.* Пашырэнне расійскага ўплыву на беларускіх землях. Полацкі царкоўны сабор і яго вынікі. Змяненні палітыкі ў галіне асветы. Да пытання аб «забароне» расійскім урадам назваў «Беларусь» і «Літва», «беларускія і літоўскія губерні», беларускай мовы і беларускага друкаванага слова.

*Крызіс прыгоннага ладу. Эканамічныя рэформы 1830 – 1850-х гг.* Асноўныя напрамкі спецыялізацыі сельскай гаспадаркі. Сацыяльныя супярэчнасці. Рэформа дзяржаўнай вёскі. Інвентарная рэформа ў памешчыцкай вёсцы. Прамысловасць. Эканамічнае становішча гарадоў. Гандаль і шляхі зносін.

**Культура Беларусі канца XVIII – першай паловы XIX ст.** Тэндэнцыі развіцця культуры Беларусі. Новыя ўмовы і асноўныя накірункі. Ідэалогія Асветніцтва. Развіццё адукацыі. Школьныя статуты 1804 і 1828 гг. Працяг паланізацыі. Роля Віленскага ўніверсітэта. Царкоўная і свецкая адукацыя. Прафесійная адукацыя. Горы-Горацкі земляробчы інстытут. Пашырэнне рускага ўплыву.

Вывучэнне гісторыі, этнаграфіі, фальклору беларусаў. Віленскі музей старажытнасцей і Віленская археалагічная камісія.

Станаўленне беларускай літаратурнай мовы і беларускай літаратуры.

Станаўленне беларускага нацыянальнага тэатра. Прыгонныя прафесійныя тэатры магнатаў. Аматарскі тэатр. Беларуская музычная культура.

Выяўленчае мастацтва Беларусі. Віленская школа жывапісу. Развіццё графікі ў Беларусі.

Библиотека БГУИР

Архітэктура Беларусі. Праваслаўнае культавае дойлідства. Забудова беларускіх гарадоў.

**Буржуазныя рэформы. Пераход да капіталістычнай гаспадаркі.** *Адмена прыгоннага права. Асаблівасці правядзення аграрнай рэформы ў Беларусі.* Прычыны адмены прыгоннага права. Падрыхтоўка сялянскай рэформы 1861 г. у Расіі. Дзейнасць віленскага генерал-губернатара У. І. Назімава. Пачатак рэформы. Маніфест Аляксандра ІІ ад 19 лютага 1861 г. і заканадаўчыя акты аб правядзенні сялянскай рэформы. Асабістыя і маёмасныя правы сялян. Новая сістэма кіравання вёскай. Міравыя пасрэднікі. Часоваабавязанае становішча сялян. Правілы выкупной аперацыі. Рэфармаванне дзяржаўнай вёскі ў Беларусі. Уплыў паўстання 1863 – 1864 гг. на правядзенне сялянскай рэформы ў беларускіх губернях. Вынікі і значэнне аграрнай рэформы.

*Буржуазныя рэформы 1860 – 1870-х гг.* Земская рэформа ў Расіі. Судовая рэформа, яе сутнасць, асноўныя прынцыпы; асаблівасці правядзення судовай рэформы ў беларускіх губернях і іх прычыны. Гарадская рэформа, асаблівасці яе ажыццяўлення ў Беларусі. Рэфармаванне арміі ў Расіі. Школьная рэформа. Класічныя і рэальныя гімназіі. Цэнзурная рэформа – пашырэнне магчымасцей друку. Вынікі і значэнне буржуазных рэформ 1860 – 1870-х гг. для Беларусі.

*Контррэформы 1880 – 1890-х гг.* у Расіі, іх прычыны і асноўныя напрамкі. Наступствы контррэформ для жыхароў беларускіх губерняў. Абмежаванні ў дачыненні да польскага (каталіцкага) і яўрэйскага (іўдзейскага) насельніцтва Беларусі.

*Развіццё капіталізму ў эканоміцы Беларусі пасля адмены прыгоннага права.* Сельская гаспадарка Беларусі ў 1860 – 1890-я гг. Асаблівасці «прускага шляху» развіцця аграрнага капіталізму. Спецыялізацыя сельскай гаспадаркі. Асаблівасці развіцця капіталістычнага бессаслоўнага землеўладання ў Беларусі і іх прычыны. Фарміраванне аграрнай буржуазіі.

Прамысловая рэвалюцыя ў Беларусі ў другой палове ХІХ ст. Асаблівасці пераходу ад ручной да машыннай вытворчасці ў прамысловасці Беларусі. Галіновая структура прамысловасці Беларусі. Развіццё прамысловасці і рост гарадоў. Будаўніцтва чыгуначных дарог на тэрыторыі Беларусі. Роля рачнога транспарту ў эканоміцы Беларусі. Гандлёвыя сувязі. Фарміраванне нацыянальнага рынку. Развіццё фінансава-крэдытнай сістэмы.

*Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў пачатку ХХ ст.* Асаблівасці прамысловага развіцця Беларусі на манапалістычнай стадыі капіталізму. Акцыянерныя таварыствы. Роля банкаў у эканамічным жыцці. Значэнне чыгункі, транспартнай сістэмы ў развіцці эканомікі. Фабрычна-заводскія цэнтры Беларусі. Асаблівасці фарміравання сацыяльнай структуры буржуазнага грамадства ў Беларусі. Паступовая капіталізацыя аграрных адносін у беларускай вёсцы.

**Грамадска-палітычнае жыццё Беларусі.** *Паўстанне 1863 – 1864 г. у Польшчы, Літве і Беларусі.* Падрыхтоўка паўстання. К. Каліноўскі і яго дзейнасць. «Мужыцкая праўда». Пачатак паўстання. Арганізацыя паўстанцкіх



Библиотека БГУИР

атрадаў і іх дзейнасць на тэрыторыі Беларусі. Сацыяльны склад беларускіх паўстанцаў. Тактыка «белых». Меры ўрадавай адміністрацыі ў сувязі з паўстаннем. Спад паўстанцкага руху. Падаўленне паўстання. Характар і вынікі паўстання, яго значэнне і ўплыў на далейшае сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё Беларусі.

*Грамадска-палітычнае жыццё ў другой палове XIX ст.* Сялянскі рух на Беларусі ў 1860 – 1890-я гг., яго прычыны, узровень і асаблівасці. Перасяленчы рух. Народніцтва ў Расіі, яго ідэалагічныя вытокі і сацыяльная база. Дзейнасць народніцкіх арганізацый на тэрыторыі Беларусі. Крызіс рэвалюцыйнага народніцтва. Ліберальнае народніцтва ў Беларусі.

Рабочы рух на Беларусі ў 1860 – 1890-я гг. Працэс фарміравання рабочага класа ў беларускіх губернях, асаблівасці яго эканамічнага і прававога становішча, нацыянальны склад і размеркаванне па галінах прамысловасці. Распаўсюджванне марксізму. Стварэнне першых сацыял-дэмакратычных арганізацый і партый у Беларусі.

*Буржуазныя рэформы ў пачатку XX ст.* Скліканне «законадарадчай» Дзяржаўнай Думы. Маніфест ад 17 кастрычніка 1905 г. Узнікненне буржуазных палітычных партый і арганізацый. Змены ў царкоўным жыцці. Свабода веравызнання. Сталыпінская аграрная рэформа. Земская рэформа ў Беларусі.

*Грамадска-палітычная барацьба ў пачатку XX ст.* Узнікненне сацыялістычных і нацыянальна-дэмакратычных партый.

Прычыны і характар першай расійскай рэвалюцыі 1905 – 1907 гг., яе рухаючыя сілы. Асноўныя падзеі ў Беларусі. Уздым рэвалюцыі. Дзяржаўны пераварот 3 чэрвеня 1907 г. Вынікі рэвалюцыі.

Грамадска-палітычная барацьба пасля рэвалюцыі. «Нашаніўскі перыяд» беларускага нацыянальнага руху.

**Беларусь у гады Першай сусветнай вайны.** Прычыны і пачатак вайны. Акупацыя немцамі Заходняй Беларусі. Бежанства. Становішча насельніцтва Беларусі. Рабочы, сялянскі, салдацкі рух. Беларускі нацыянальны рух у час вайны.

**Беларусь у час Лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі.** Прычыны і характар рэвалюцыі. Падзеі ў Петраградзе. Звяржэнне самадзяржаўя і ўстанаўленне двоеўладдзя. Расстаноўка палітычных сіл. Рэвалюцыйныя падзеі ў Беларусі і ўтварэнне новых органаў улады. Дэмакратызацыя грамадства. Погляды на далейшае развіццё краіны. Палярызацыя палітычных сіл у Беларусі. Уплыў рэвалюцыі на беларускі нацыянальны рух. Вынікі рэвалюцыі.

**Фарміраванне беларускай нацыі.** Аб’ектыўныя ўмовы, у якіх адбывалася фарміраванне беларускай нацыі, яе асноўныя прыкметы. Этнічная тэрыторыя беларусаў. Нацыянальны склад насельніцтва. Станаўленне беларускай літаратурнай мовы і фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці. Эканамічнае жыццё і сацыяльная структура грамадства. Беларускае нацыянальнае мастацтва.

**Культура Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.** Асноўныя тэндэнцыі развіцця культуры Беларусі. Развіццё адукацыі, навукі, друку. Школьная рэформа 1860 – 1880-х гг. Змены ў сістэме школьнай адукацыі ў



Библиотека БГУИР

пачатку XX ст. Прафесійная адукацыя. Навуковае беларусазнаўства. Кніжны і перыядычны друк. «Минский листок». Дзейнасць выдавецтва «Загляне сонца і ў наша аконца». Значэнне газет «Наша доля» і «Наша ніва» для беларускай культуры. Развіццё беларускай літаратуры.

Станаўленне нацыянальнага прафесійнага тэатра. Музычнае мастацтва Беларусі. Выяўленчае мастацтва. Усталяванне стылю рэалізму. Архітэктура.

## ТЭМА V. ПАДЗЕІ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ Ў БЕЛАРУСІ. НАЦЫЯНАЛЬНА-ДЗЯРЖАЎНАЕ БУДАЎНІЦТВА. ГРАМАДЗЯНСКАЯ ВАЙНА І ІНШАЗЕМНАЯ ІНТЭРВЕНЦЫЯ: ПАЧАТАК НАЙНОЎШАГА ЧАСУ Ў АЙЧЫННАЙ ГІСТОРЫІ (ЛЮТЫ 1917 – 1920 г.)

**Падзеі Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Беларусі.** Альтэрнатывы грамадска-палітычнага развіцця Расіі пасля Лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі.

*Кастрычніцкая рэвалюцыя: розныя канцэпцыі.* Марксісцка-ленінская канцэпцыя. Ліберальна-буржуазная канцэпцыя і яе разнавіднасць аб ажыццяўленні Кастрычніцкай рэвалюцыі бальшавікамі за грошы германскага генеральнага штаба. Канцэпцыя Кастрычніцкай рэвалюцыі як сіяністка-масонскай змовы супраць Расіі.

*Устанаўленне савецкай улады ў Беларусі.* Абвастрэнне сацыяльна-эканамічнага і палітычнага крызісу ў Расіі восенню 1917 г. Узброенае паўстанне ў Петраградзе. Перамога рэвалюцыі ў Беларусі і на Заходнім фронце. Барацьба супраць меншавіцка-эсэраўскага «Камітэта выратавання рэвалюцыі». Разгортванне грамадзянскай вайны. З'езды Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў Заходняй вобласці, сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў, армій Заходняга фронту. Утварэнне абласнога выканаўчага камітэта Заходняй вобласці і фронту (Аблвыканкамзаха) і абласнога Савета Народных Камісараў (СНК). Рэвалюцыйныя пераўтварэнні. Кастрычніцкая рэвалюцыя – заканамерны вынік грамадскага развіцця Расіі, пачатак Найноўшага часу ў айчыннай гісторыі.

*Размежаванне палітычных сіл у Беларусі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. І Усебеларускі з'езд (снежань 1917 г.).* Рашэнне з'езда аб утварэнні новага краявога органа ўлады – Усебеларускага Савета сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў. Разгон з'езда. Узмацненне канфрантацыі палітычных сіл Беларусі пасля разгону з'езда.

**Беларусь у час германскай акупацыі 1918 г. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР).** Пашырэнне германскай акупацыі ў лютым 1918 г. Брэсцкі мірны дагавор, яго вынікі для Беларусі. Барацьба беларускага народа супраць нямецкіх захопнікаў. Беларускі нацыянальны рух на захопленай ворагам тэрыторыі. Тры Устаўныя граматы аб абвяшчэнні Беларускай Народнай Рэспублікі. Дзейнасць урада БНР – Народнага сакратарыята.



Библиотека БГУИР

Заканчэнне Першай сусветнай вайны. Версальска-Вашынгтонская сістэма і планы пасляваеннай перабудовы Еўропы і ўсяго свету. Утварэнне новых дзяржаў. Адраджэнне Польшчы. Праблема польскіх межаў. Дзяржаўнае будаўніцтва ў краінах Балтыі. Фарміраванне тэрыторыі сучаснай Літвы. Скасаванне Брэсцкага мірнага дагавора. Вызваленне тэрыторыі Беларусі ад германскіх акупантаў.

**Утварэнне Беларускай ССР. Аб'яднанне Беларускай ССР з Літоўскай ССР.** Праблема беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці пасля вызвалення Беларусі ад нямецкіх захопнікаў. Розныя пазіцыі па гэтым пытанні кіраўніцтва Паўночна-Заходняга абкома РКП(б), Аблвыканкамзаха, Абласнога СНК і Беларускага нацыянальнага камісарыята (Белнацкама), Цэнтральнага бюро беларускіх секцый РКП(б). Пастанова пленума ЦК РКП(б) ад 24 снежня 1918 г. VI Паўночна-Заходняя абласная партыйная канферэнцыя ў Смаленску. Абвяшчэнне канферэнцыі І з'ездам Кампартыі бальшавікоў Беларусі і яго рашэнні. Маніфест Часовага ўрада ад 1 студзеня 1919 г. аб утварэнні БССР.

І Усебеларускі з'езд Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. Прыняцце Канстытуцыі БССР, вызначэнне тэрыторыі рэспублікі ў складзе Мінскай і Гродзенскай губерняў. Рашэнне з'езда аб аб'яднанні Беларускай ССР і Літоўскай ССР. Утварэнне аб'яднанай дзяржавы – Літбела.

**Захоп тэрыторыі Беларусі войскамі Польшчы. Савецка-польская вайна 1919 – 1920 гг.** Пачатак польскай інтэрвенцыі. Ваенныя дзеянні вясной – летам 1919 г. Акупацыя значнай часткі тэрыторыі Беларусі.

Барацьба беларускага народа супраць польскіх інтэрвентаў. Беларускі нацыянальны рух ва ўмовах польскай інтэрвенцыі. Тактыка беларускіх нацыянальна-дэмакратычных партый у адносінах да акупацыйных улад. Дзейнасць Рады БНР ва ўмовах польскай інтэрвенцыі. Распад беларускага нацыянальнага руху. Утварэнне новай Народнай рады.

Наступленне войск Заходняга фронту ў ліпені 1920 г. Вызваленне тэрыторыі Беларусі ад польскіх інтэрвентаў. Прычыны паражэння Чырвонай Арміі ў Вісленскай (Варшаўскай) аперацыі. Контрнаступленне польскіх войскаў. Паўторны захоп часткі тэрыторыі Беларусі.

Ліквідацыя Літбела. Аднаўленне Беларускай ССР. ІІ Усебеларускі з'езд Саветаў. Заканчэнне савецка-польскай вайны. Рыжскі мірны дагавор і яго вынікі для Беларусі.

Становішча гаспадаркі і культуры Беларусі ў 1919 – 1920 гг. Палітыка «ваеннага камунізму».

## ТЭМА VI. САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ ВА ЎМОВАХ НОВАЙ ЭКАНАМІЧНАЙ ПАЛІТЫКІ І ПАБУДОВЫ САЦЫЯЛІЗМУ: САВЕЦКАЯ МАДЭЛЬ МАДЭРНІЗАЦЫІ. ЗАХОДНЯЯ БЕЛАРУСЬ ПАД УЛАДАЙ ПОЛЬШЧЫ (1921 – 1939 гг.)

**Ад палітыкі «ваеннага камунізму» да новай эканамічнай палітыкі.**

Библиотека БГУИР

**Новая эканамічная палітыка, яе сутнасць і вынікі.** Прычыны адмены палітыкі «ваеннага камунізму». Новая эканамічная палітыка і яе сутнасць. Грашовая рэформа. «Ножніцы цэн» і крызіс збыту прамысловай прадукцыі. Карэнная перабудова сацыяльнай сферы, адмова ад ваенна-камуністычных прынцыпаў размеркавання.

Аднаўленне і будаўніцтва прадпрыемстваў. Энергазабеспячэнне. Працоўны энтузіязм. Маральныя стымулы. Павышэнне матэрыяльнага дабрабыту працоўных.

Утварэнне СССР. Уваходжанне БССР у склад СССР. Вынікі аднаўлення народнай гаспадаркі БССР.

**Сацыялістычная індустрыялізацыя ў Беларускай ССР.** Паступовае згортванне новай эканамічнай палітыкі. Аб’ектыўная неабходнасць правядзення новага эканамічнага курсу. XIV з’езд ВКП(б) (снежань 1925 г.). Курс на сацыялістычную індустрыялізацыю. Сутнасць і змест палітыкі індустрыялізацыі. Паслядоўнасць развіцця галін прамысловасці, сродкі для капітальнага будаўніцтва, тэрміны і тэмпы індустрыялізацыі. Асаблівасці правядзення палітыкі індустрыялізацыі ў БССР. Спробы фальсіфікацыі палітыкі сацыялістычнай індустрыялізацыі. Памылкі і недахопы ў ажыццяўленні індустрыялізацыі. Вынікі правядзення палітыкі індустрыялізацыі.

**Калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў Беларускай ССР.** Кааператыванне ў БССР, формы сельскагаспадарчай кааперацыі. Аб’ектыўная неабходнасць карэннай перабудовы сельскай гаспадаркі. XV з’езд ВКП(б) (снежань 1927 г.). Курс на калектывізацыю сельскай гаспадаркі. Палітыка калектывізацыі сельскай гаспадаркі, яе сутнасць. Калгасы як асноўная форма кааператыўнага будаўніцтва, дзяржаўная дапамога перабудове вёскі. Пераход да суцэльнай калектывізацыі сельскай гаспадаркі і фарсіраванне яе тэмпаў. Ліквідацыя кулацтва як класа на базе суцэльнай калектывізацыі. Перагібы і памылкі ў калгасным будаўніцтве.

Завяршэнне калектывізацыі ў БССР. Наладжванне кіравання калгасна-саўгаснай вытворчасцю. Сацыяльныя змены ў вёсцы. Стварэнне буйных механізаваных, высокатаварных сельскагаспадарчых прадпрыемстваў – магістральны шлях развіцця аграрнага сектару эканомікі.

**Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларускай ССР.** *Асноўныя рысы беларускага савецкага грамадства.* Адміністрацыйная і палітычная сістэма беларускага савецкага грамадства. Супярэчнасці грамадска-палітычнага жыцця ў Беларусі. Пашырэнне кампетэнцыі Саветаў як органаў улады, іх ажыўленне і дэмакратызацыя. Другая Канстытуцыя БССР. Станаўленне аднапартыйнай сістэмы, месца і роля Камуністычнай партыі Беларусі ў сістэме дыктатуры пралетарыяту.

*Нацыянальныя адносіны і палітыка беларусізацыі.* Асаблівасці нацыянальнага складу насельніцтва Беларусі. Передумовы палітыкі беларусізацыі, яе сутнасць. Рашэнні КП(б) Беларусі ў галіне нацыянальнай палітыкі. Спецыяльная камісія па беларусізацыі.



Библиотека БГУИР

Два ўзбуйненні тэрыторыі Беларусі. Беларусізацыя дзяржаўных устаноў, грамадскіх арганізацый, кіруючага адміністрацыйнага корпуса, вайсковых фарміраванняў. Беларусізацыя ў галіне нацыянальна-культурнага будаўніцтва: агульнаадукацыйная і вышэйшая школа, навука, выдавецкая справа і перыядычны друк.

Супярэчнасці, цяжкасці і недахопы ў ажыццяўленні палітыкі беларусізацыі. Вынікі палітыкі беларусізацыі.

*Канфесійная палітыка Савецкай дзяржавы.* Антырэлігійная прапаганда. «Абнаўленства». Абвяшчэнне аўтакефаліі Беларускай праваслаўнай царквы. Рэпрэсіі супраць праваслаўнай і каталіцкай цэркваў у 1930-я гг.

**Палітычная барацьба ў СССР і БССР: прычыны, маштабы, розныя меркаванні.** Розныя погляды на Кастрычніцкую рэвалюцыю. Кастрычніцкая рэвалюцыя: крывавая і бязлітасная, мірная і гвалтоўная палітычная барацьба.

Палітычная барацьба на этапе будаўніцтва сацыялізму ў адной, асобна ўзятай краіне. Сутнасць і прычыны палітычных рэпрэсій. Палітычная барацьба ў кіруючых колах краіны ў другой палове 1930-х – пачатку 1940-х гг. Розныя падыходы да нацыянальнай палітыкі і шляхоў сацыяльна-палітычнага развіцця краіны. Парушэнні сацыялістычнай законнасці. Справа «Саюза вызвалення Беларусі». Памеры і вынікі палітычных рэпрэсій ў Беларусі.

**Культурная рэвалюцыя ў Беларускай ССР.** Ліквідацыя непісьменнасці дарослага насельніцтва і ўвядзенне ўсеагульнага абавязковага навучання дзяцей. Характэрныя рысы савецкай сістэмы народнай адукацыі. Стварэнне і дзейнасць Рэспубліканскай надзвычайнай камісіі па ліквідацыі непісьменнасці. Работа па ліквідацыі непісьменнасці і яе вынікі. Падрыхтоўка і ўвядзенне ўсеагульнага абавязковага пачатковага навучання і паступовы пераход да ўвядзення ўсенавуча на базе сямігадовай школы.

*Прафесійная адукацыя. Станаўленне і развіццё вышэйшай школы.* Падрыхтоўка спецыялістаў для гаспадаркі і культуры. Адкрыццё БДУ. Стварэнне навучальных устаноў па падрыхтоўцы педагагічных, медыцынскіх, інжынерна-тэхнічных і сельскагаспадарчых кадраў. Рэарганізацыя навучальных устаноў. Роля школ фабрычна-заводскага навучання ў вырашэнні праблемы забеспячэння прамысловасці, будаўніцтва, транспарту, сувязі кваліфікаванымі рабочымі. Стварэнне сістэмы працоўных рэзерваў СССР і БССР.

*Беларуская савецкая навука* і яе ўплыў на далейшае развіццё прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Інбелкульт. Беларуская Акадэмія навук.

*Беларуская літаратура: асноўныя напрамкі развіцця.* Асаблівасці развіцця беларускай літаратуры. Літаратурныя аб'яднанні «Маладняк», «Узвышша», «Полымя». Творчасць беларускіх празаікаў і паэтаў. Сувязь беларускай літаратуры з літаратурай іншых народаў. Саюз пісьменнікаў БССР.

*Сцэнічнае тэатральнае мастацтва.* Адкрыццё БДТ-1. Мастацкая майстэрня У. Галубка. БДТ-2 у Віцебску. Беларускі дзяржаўны тэатр (БДТ-3) у Гомелі. Таленавітыя майстры сцэны.

*Музычнае мастацтва.* Беларуская дзяржаўная кансерваторыя як цэнтр падрыхтоўкі музычных кадраў. Адкрыццё Беларускага тэатра оперы і балета.



Библиотека БГУИР

Беларуская дзяржаўная філармонія, яе роля ў музычным жыцці Беларусі.

*Кінамастацтва*. Кінахроніка, дакументальныя і мастацкія фільмы.

*Жывапіс, скульптура і архітэктура.* Віцебскі мастацкі тэхнікум – цэнтр падрыхтоўкі мастацкіх кадраў. Характар і тэматыка беларускага жывапісу. Саюз мастакоў БССР. Скульптура. Спалучэнне народных традыцый з дасягненнямі тагачаснага майстэрства. Майстры жанра. Архітэктура – своеасаблівы «мураваны летапіс». Рэарганізацыя народнай гаспадаркі як стымул развіцця прамысловай архітэктуры. Рэканструкцыя і забудова гарадоў. Помнікі дойлідства Г. Лаўрова, А. Воінава, У. Лангбарда. Саюз архітэктараў БССР – цэнтр развіцця творчай думкі.

**Пабудова ў СССР і БССР сацыялістычнага грамадства.** Рэвалюцыйная ломка, разбурэнне старога ладу жыцця і стварэнне новага сацыялістычнага грамадства: цана і вынікі. Змены ў сферы эканомікі і дзяржаўнага будаўніцтва. Змяненне адносін да гісторыі і гісторыкаў. Пачатак аднаўлення законнасці, прававога парадку. Змены ў народнай асвеце, маральна-бытавых умовах жыцця грамадзян. Характарыстыка савецкага сацыялістычнага грамадства. Асоба І. В. Сталіна: супярэчлівасць ацэнак.

**Заходняя Беларусь пад уладай Польшчы.** *Сацыяльна-эканамічнае становішча заходнебеларускіх зямель.* Рыжскі дагавор і падзел Беларусі. «Усходнія крэсы» Польшчы. Прамысловасць і сельская гаспадарка Заходняй Беларусі. Асадніцтва. Камасацыя і хутарызацыя. Міграцыя беларусаў у краіны Заходняй Еўропы, Паўночнай і Паўднёвай Амерыкі. Паліцэйскі тэрор. Пацыфікацыі. Дэфензіва.

*Нацыянальна-вызваленчы, сялянскі і рабочы рух. Палітычныя партыі і арганізацыі*. Утварэнне і дзейнасць Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі і Беларускай сялянска-рабочай грамады. Сусветны эканамічны крызіс 1929 – 1933 гг. і абвастрэнне барацьбы працоўных за свае правы, за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне. К. Арлоўскі, С. Ваўпшасаў, А. Валынец, В. Корж, Ф. Маркаў, М. Арэхва, С. Прытыцкі, В. Харужая, У. Царук – змагары за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне працоўных, за ўз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР ў адзінай дзяржаве.

*Рэлігійнае жыццё. Неа-унія ў Заходняй Беларусі.* Новая унія. Узмацненне прымусовага схілення праваслаўных у каталіцтва і уніяцтва. Разрыў кананічных сувязей праваслаўнай царквы ў Польшчы з Маскоўскім патрыярхатам.

*Заходнебеларуская культура ў 1920 – 1930-я гг.* Палітыка польскіх улад у галіне культуры. Школа, друк, літаратура і мастацтва. Б. Тарашкевіч. Роля Таварыства беларускай школы ў захаванні і развіцці культуры на заходнебеларускіх землях.

Библиотека БГУИР

## ТЭМА VII. БЕЛАРУСЬ У ГАДЫ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ І ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ (ВЕРАСЕНЬ 1939 г. – ВЕРАСЕНЬ 1945 г.)

Выключана з курса «Гісторыя Беларусі» ў сувязі з увядзеннем з 2010 – 2011 навучальнага года новай дысцыпліны «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)».

## ТЭМА VIII. САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ, ПАЛІТЫЧНАЕ І КУЛЬТУРНАЕ РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКАЙ ССР. ЗАМЕЖНЫЯ СУВЯЗІ (1945 – 1990 гг.)

**Беларуская ССР у першыя пасляваенныя гады. Аднаўленне народнай гаспадаркі.** *Вынікі акупацыі для эканомікі Беларусі.* Ваенныя разбурэнні і велізарныя страты. Гераічная праца беларускага народа па адраджэнні рэспублікі. Дапамога саюзных рэспублік у аднаўленні народнай гаспадаркі. Першы этап аднаўлення эканомікі (1943 – 1945 гг.): металаапрацоўка, машынабудаванне, электраэнергетыка, чыгуначны транспарт. Забеспячэнне патрэб фронту. Меры па паляпшэнні становішча насельніцтва. Другі этап аднаўлення (1946 – 1950 гг.). Задачы чацвёртага пяцігадовага плана і яго рэалізацыя. Стварэнне новых галін вытворчасці. Пераўтварэнне машынабудавання і металаапрацоўкі ў вядучую галіну эканомікі. Паскораныя тэмпы індустрыялізацыі. Аднаўленне калгасна-саўгаснай сістэмы. Цяжкасці пасляваеннага развіцця вёскі. Завяршэнне сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў у Заходняй Беларусі. Высокія тэмпы індустрыялізацыі ў заходніх раёнах. Вырашэнне сацыяльных праблем, становішча працоўных горада і вёскі. Адмена картачнай сістэмы і грашовая рэформа 1947 г. Вынікі аднаўлення народнай гаспадаркі, стварэнне ўмоў для далейшага яе развіцця.

*Грамадска-палітычнае жыццё.* Аднаўленне даваеннай палітычнай сістэмы. Культ асобы І. В. Сталіна. Барацьба з касмапалітызмам і «беларускім нацыяналізмам». Узмацненне рэпрэсій. Складаная сітуацыя ў заходніх рэгіёнах Беларусі.

**Беларуская ССР у 1950-я – першай палове 1960-х гг.** *Спробы дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця.* Змены ў грамадска-палітычным жыцці пасля смерці І. В. Сталіна. Барацьба за ўладу. XX з’езд КПСС. Пачатак рэабілітацыі ахвяр палітычных рэпрэсій. Пашырэнне правоў саюзных рэспублік. Палітычныя і адміністрацыйныя рэформы. Непаслядоўнасць і супярэчлівасць працэсу дэмакратызацыі савецкага грамадства. Прыняцце праграмы пабудовы камунізму.

*Навуковыя даследаванні ў Беларусі. Навукова-тэхнічны прагрэс у прамысловасці і асаблівасці яе развіцця.* Асноўныя тэндэнцыі эканамічнага развіцця рэспублікі. Спробы ажыццяўлення эканамічных рэформ у СССР у 1950-я гг. Навукова-тэхнічны прагрэс у прамысловасці і асаблівасці яе развіцця. Уклад Беларусі ў вывучэнне і асваенне космасу.

*Сельская гаспадарка ў 1950-я – пачатку 1960-х гг.* Спробы ўздыму

Библиотека БГУИР

сельскай гаспадаркі шляхам рэформ. Павышэнне нарыхтоўчых цэн, змяненні ў сістэме дзяржпаставак, умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы сельскай гаспадаркі. Вырашэнне праблемы вытворчасці збожжа. Прыняцце рашэння аб асваенні цалінных і абложных зямель і ўдзел Беларусі ў гэтай справе. Рэарганізацыя МТС. Кампанія па ўціску на асабістыя гаспадаркі сялян.

*Матэрыяльныя ўмовы жыцця.* Паступовае паляпшэнне дабрабыту насельніцтва. Абвастрэнне жыллёвай праблемы і актыўнае жыллёвае будаўніцтва.

**Беларуская ССР у другой палове 1960-х – першай палове 1980-х гг.** *Грамадска-палітычнае жыццё.* Паварот кіраўніцтва дзяржавы да больш жорсткага кансерватыўнага курсу. Роля Саветаў, Кампартыі Беларусі, камсамола, прафсаюзаў у жыцці грамадства. Кіраўніцтва рэспублікі. Дзейнасць П. М. Машэрава, Ц. Я. Кісялёва. Панаванне канцэпцыі развітога сацыялізму. Прыняцце Канстытуцыі СССР 1977 г. і Канстытуцыі БССР 1978 г. Перадумовы крызісу савецкай грамадска-палітычнай сістэмы.

*Навукова-тэхнічны прагрэс у прамысловасці Беларусі і асаблівасці яе развіцця.* Эканамічныя праблемы першай паловы 1960-х гадоў і пачатак эканамічнай рэформы, яе асноўныя накірункі ў галіне прамысловасці. Паступовае згортванне рэформы. Далейшае ўзмацненне каманднаадміністрацыйнай сістэмы кіраўніцтва эканомікай. Экстэнсіўныя і інтэнсіўныя фактары развіцця эканомікі. Дынаміка развіцця прамысловасці, змены ў яе структуры. Развіццё нафтаперапрацоўкі, прыборабудавання, хімічнай і іншых перспектыўных галін. Укараненне дасягненняў НТР у эканоміку і ператварэнне БССР у індустрыяльную рэспубліку з магутным вытворча-эканамічным і навукова-тэхнічным патэнцыялам. Спецыялізацыя прамысловасці Беларусі ў агульнасаюзным маштабе. Увядзенне ў строй новых прадпрыемстваў. Канцэнтрацыя вытворчасці. Далейшае развіццё транспарту і будаўніцтва трубаправодаў. Уступленне ў эксплуатацыю Мінскага метрапалітэна (першая чарга). Інтэнсіўная ўрбанізацыя. Праяўленне негатыўных з’яў у індустрыяльным развіцці Беларусі ў канцы 1970-х – пачатку 1980-х гг.

*Сельская гаспадарка*: поспехі і праблемы. Спробы рэфармавання аграрнага сектара эканомікі ў сярэдзіне 1960-х гг. Выкарыстанне эканамічных стымулаў развіцця сельскай гаспадаркі. Намаганні па яе інтэнсіфікацыі. Спецыялізацыя сельскай гаспадаркі Беларусі. Канцэнтрацыя сельскагаспадарчай вытворчасці. Распрацоўка і зацвярджэнне «Харчовай праграмы СССР на перыяд да 1990 г.». Стварэнне Белаграпрома. Нарастанне негатыўных з’яў у сельскай гаспадарцы.

*Матэрыяльныя ўмовы жыцця насельніцтва.* Развіццё сацыяльнай сферы. Грамадскія фонды спажывання. Жыллёвае будаўніцтва. Узнікненне дэфіцыту некаторых тавараў народнага спажывання. Неабходнасць змен.

**Палітыка перабудовы, яе змест і шляхі ажыццяўлення.** Курс на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця. Распрацоўка палітыкі перабудовы, яе неабходнасць і сутнасць. Стварэнне міфаў аб савецкай сістэме і ўнясенне іх у грамадскую свядомасць. Адступленне ад першапачатковых задумак і пераўтварэнне палітыкі перабудовы ў сродак капіталістычнай

Бібліятэка БГУІР

рэстаўрацыі. Утварэнне і дзейнасць палітычнай апазіцыі. Крах палітыкі перабудовы.

Крызіс аднапартыйнай савецкай сістэмы. Наступленне на КПСС з боку сіл капіталістычнай рэстаўрацыі ў гады перабудовы. Пачатак развалу СССР. Прыняцце Вярхоўным Саветам БССР 27 ліпеня 1990 г. Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце рэспублікі.

**Культура Беларускай ССР у 1950-я – 1980-я гг.** Асноўныя тэндэнцыі развіцця культуры Беларусі. Аднаўленне ўстаноў культуры ў пасляваенныя гады. Адукацыя і навука. Змяненні ў сістэме агульнаадукацыйнай школы ў 1950 – 1960-я гг. Увядзенне ўсеагульнай сярэдняй адукацыі моладзі. Прафесійна-тэхнічная, сярэдняя спецыяльная і вышэйшая адукацыя. Адкрыццё новых вышэйшых навучальных устаноў. Далейшае развіццё матэрыяльнай і даследча-эксперыментальнай базы навукі. Дзейнасць Акадэміі навук БССР. Навуковыя школы. Дасягненні рэспублікі ў сферы адукацыі і навукі ў 1970-я – 1980-я гады.

Установы культуры і выдавецкая дзейнасць. Развіццё літаратуры. Тэатральнае мастацтва. Дзейнасць беларускіх рэжысёраў. Выдатныя беларускія акцёры. Музычнае мастацтва. Творчасць беларускіх кампазітараў. Музычныя калектывы і тэатры. Выдатныя артысты беларускай оперы і балета. Выяўленчае мастацтва – жывапіс, графіка, скульптура. Жанры і накірункі ў мастацтве. Манументальнае мастацтва. Уплыў культуры на духоўнае жыццё грамадства.

Змены ў галіне культуры ў другой палове 1980-х гг. Пашырэнне сферы ўжывання беларускай мовы. Пачатак рэформы агульнаадукацыйнай, прафесійнай і вышэйшай школ. Пашырэнне тэматыкі літаратурных твораў. Павелічэнне колькасці прафесійных тэатраў. Развіццё музычнай культуры. Змены ў тэматыцы твораў выяўленчага мастацтва. Захаванне помнікаў айчыннай гісторыі і культуры.

**Беларуская ССР на міжнароднай арэне.** Выхад БССР на міжнарожную арэну. Месца Беларусі ў сусветным супольніцтве ў пасляваенныя гады. Кампетэнцыя саюзных рэспублік у галіне знешняй палітыкі. Прадстаўніцтва БССР у ААН. «Халодная вайна» і міжнародныя адносіны. Удзел БССР у барацьбе за вырашэнне глабальных сацыяльна-палітычных праблем, за мір і бяспеку. Абмен дэлегацыямі. Уключэнне БССР у міжнародны рух параднёных гарадоў. Гандлёва-эканамічныя сувязі з замежнымі краінамі. Культурны і навуковы абмен. Супрацоўніцтва ў галіне спорту і турызму. Змененне ўмоў знешнепалітычнай дзейнасці ў другой палове 1980-х гг.

## ТЭМА IX. РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ НА ШЛЯХУ СТАНАЎЛЕННЯ І ЎМАЦАВАННЯ ДЗЯРЖАЎНАГА СУВЕРЭНІТЭТУ (1991 – 2011 гг.)

**Дзяржаўны пераварот у Маскве ў жніўні 1991 г. Абвяшчэнне незалежнасці Беларусі. Ліквідацыя СССР: розныя погляды і меркаванні.** Правядзенне рэферэндуму па пытанні захавання Саюза ССР вясной 1991 г. Распрацоўка тэкста новага Саюзнага дагавора. Дзяржаўны пераварот у Маскве

Библиотека БГУИР

ў 1991 г. Канчатковы зыход з арэны КПСС як палітычнага кіраўніка дзяржавы. Памылкі і пралікі ў дзейнасці КПСС – КПБ.

Абвяшчэнне незалежнасці Беларусі. Прыняцце закона «Аб наданні статусу канстытуцыйнага закона Дэкларацыі Вярхоўнага Савета БССР аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі». Змена назвы «БССР» на назву «Рэспубліка Беларусь». Герб «Пагоня» і бела-чырвона-белы сцяг – дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь.

Ліквідацыя СССР. Дэнансацыя Дагавора аб утварэнні СССР 1922 г. Стварэнне Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Разгром КПСС і развал СССР – драматычныя падзеі сусветнай гісторыі ХХ ст. Прычыны краху савецкага дзяржаўнага і грамадскага ладу.

**Грамадска-палітычнае жыццё. Рэспубліка Беларусь на мяжы ХХ – ХХІ стст.** Прыняцце 15 сакавіка 1994 г. Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Выбранне першага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі. Рэспубліканскі рэферэндум 14 мая 1995 г. Наданне рускай мове роўнага статусу з беларускай мовай. Чаму на рэферэндуме большасць беларускага народа адмовілася ад герба «Пагоня» і бела-чырвона-белага сцяга? Канфрантацыя палітычнай апазіцыі з уладнымі структурамі ў 1995 – 1996 гг. Першы Усебеларускі народны сход 19 – 20 кастрычніка 1996 г. Рэспубліканскі рэферэндум 24 лістапада 1996 г. Чаму на рэферэндуме большасць беларускага народа падтрымала прапанову аб перанясенні Дня незалежнасці (Дня рэспублікі) з 27 ліпеня на 3 ліпеня? Іншыя пытанні, вынесеныя на рэферэндум. Стварэнне двухпалатнага Нацыянальнага Сходу. Далейшая дэмакратызацыя беларускага грамадства. Другі Усебеларускі народны сход. Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2001 – 2005 гг. Зацвярджэнне музыкі і слоў Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь. Рэспубліканскі рэферэндум 17 кастрычніка 2004 г. Трэці Усебеларускі народны сход. Асноўныя напрамкі сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2006 – 2010 гг. Чацвёрты Усебеларускі народны сход і выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (снежань 2010 г.).

Утварэнне і дзейнасць палітычных партый, грамадскіх арганізацый, аб’яднанняў і рухаў. Фарміраванне шматпартыйнай сістэмы.

**Канфесійная палітыка. Адраджэнне рэлігійнага жыцця.** Спецыфіка рэлігійнай сітуацыі ў Беларусі. Становішча праваслаўнай царквы. Адраджэнне рэлігійнага жыцця ў іншых канфесіях. Нетрадыцыйныя рэлігійныя накірункі і рухі. Закон Рэспублікі Беларусь «Аб свабодзе веравызнання і рэлігійных арганізацыях».

**Рэспубліка Беларусь на шляху рынachных рэформ. Асаблівасці беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця.** Сутнасць рынку і рыначнай эканомікі. Рынак нецывілізаваны, грабежніцкі, гангстэрска-мафіёзны і рынак цывілізаваны, рэгуляваны дзяржавай, сацыяльна арыентаваны. Правядзенне рыначных рэформ метадам «шокавай тэрапіі» ў 1992 – 1994 гг. Правядзенне рыначных рэформ у Беларусі у 1994 – 2011 гг. Асаблівасці беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця.



Библиотека БГУИР

Сусветны фінансава-эканамічны крызіс 2008 – 2010 гг. і яго ўплыў на развіццё эканомікі і сацыяльнай сферы Рэспублікі Беларусь.

**Культура Беларусі на сучасным этапе.** *Развіццё адукацыі і навукі* – асноўны напрамак дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры. Дзіцячае дашкольнае выхаванне. Агульнаадукацыйная школа, яе структура. Гімназіі і ліцэі. Прафесійна-тэхнічныя вучылішчы, сярэднія спецыяльныя і вышэйшыя навучальныя установы. Каледжы ў сістэме адукацыі. Дзяржаўныя і недзяржаўныя вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы.

Нацыянальная Акадэмія навук – цэнтр беларускай навукі. Галіновая навука і навука ў вышэйшых навучальных установах. Вядомыя беларускія вучоныя. Праблемы і цяжкасці ў развіцці беларускай навукі.

*Асаблівасці развіцця літаратуры, выяўленчага мастацтва, музыкі. Ахова гісторыка-культурнай спадчыны.* Беларускія пісьменнікі, паэты, драматургі. Праблематыка іх твораў. Беларускае выяўленчае мастацтва. Выставачная дзейнасць, пашырэнне мастацкага рынку. Стан тэатральнага і музычнага мастацтва. Беларуская дзяржаўная кансерваторыя (Беларуская акадэмія музыкі). Выдатныя дзеячы музычнай культуры Беларусі. Беларуская дзяржаўная філармонія і абласныя філармоніі ў цэнтры канцэртнай дзейнасці. Прафесійныя музычныя калектывы Беларусі. Фестывальны рух у Беларусі. Ахова помнікаў айчыннай гісторыі і культуры. Замкавы комплекс «Мір», Віцебская Благавешчанская царква, Барысаглебская (Каложская) царква ў Гродне, гісторыка-культурная спадчына Нясвіжа, Полацкі гісторыка-культурны запаведнік. Праекты рэстаўрацыі помнікаў архітэктуры на Навагрудчыне, Лідскага замка, Старога замка ў Гродне, гістарычнай забудовы Мінска, Брэста і іншых старажытных беларускіх гарадоў.

**Рэспубліка Беларусь у міжнародным супольніцтве**. Развіццё знешніх сувязей. Устанаўленне дыпламатычных сувязей з краінамі свету. Падпісанне Хельсінскага заключнага акта. Асноўныя прынцыпы знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь. Беларуска-расійскія адносіны. Намаганні па стварэнні саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі: дасягненні і праблемы. Гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва з краінамі СНД і дзяржавамі далёкага замежжа. Міжнародныя кантакты ў галіне ліквідацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Удзел спартсменаў Беларусі ў Алімпійскіх гульнях Беларуская дыяспара: мінулае і сучаснае.

**Заключэнне.** Чаму вучыць гісторыя Беларусі? Аб чым сведчыць гістарычны вопыт? Грамадска-палітычнае становішча і перспектывы развіцця Рэспублікі Беларусь. Магістральны шлях развіцця Рэспублікі Беларусь – пабудова грамадства сацыяльнай справядлівасці.

Библиотека БГУИР

# 4. Тэматыка і змест семінарскіх заняткаў

## 4.1. ПЛАНЫ СЕМІНАРСКІХ ЗАНЯТКАЎ ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ «ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ» ДЛЯ СТУДЭНТАЎ ДЗЁННАЙ ФОРМЫ НАВУЧАННЯ

### Тэма І. Першабытнае грамадства на тэрыторыі Беларусі. Фарміраванне этнічных супольнасцей. Станаўленне і развіццё феадальных адносін (ад старажытных часоў да другой паловы XIII ст.)

(4 гадзіны)

1-я заняткі

Фарміраванне этнічных супольнасцей

План

1. Засяленне сучасных беларускіх зямель. Даіндаеўрапейскі і індаеўрапейскі перыяды этнічнай гісторыі Беларусі. Фарміраванне этнічных супольнасцей на тэрыторыі Беларусі.
2. Узнікненне Беларусі і беларускага этнасу: розныя падыходы і канцэпцыі.

Прыкладныя тэмы рэфератаў:

1. Паходжанне назвы «Белая Русь».
2. Сутнасць канцэпцыі М.Ф. Піліпенкі аб узнікненні беларускага этнасу.

**Пытанні і заданні для самападрыхтоўкі**

1. Ахарактарызуйце даіндаеўрапейскі перыяд этнічнай гісторыі Беларусі. Чаму ён так называецца?
2. Што такое неалітычная рэвалюцыя ці першая цывілізацыйная рэвалюцыя? Чым яна абумоўлена?
3. Прааналізуйце розныя канцэпцыі прарадзімы індаеўрапейцаў. Чаму канцэпцыя пярэднеазіяцкай прарадзімы індаеўрапейцаў лічыцца найбольш навукова абгрунтаванай?
4. Прасачыце па карце шляхі міграцыі індаеўрапейцаў са сваёй прарадзімы.
5. Прааналізуйце розныя канцэпцыі прарадзімы славян. Чаму канцэпцыя цэнтральнаеўрапейскай лакалізацыі славян з'яўляецца найбольш навукова абгрунтаванай?
6. Якія прычыны прымусілі славян мігрыраваць са сваёй прарадзімы? Па якіх шляхах ішла славянская міграцыя?
7. У чым сутнасць і ў чым памылковасць канцэпцый паходжання беларусаў: польскай і вялікарускай, крывіцкай і крывіцка-дрыгавіцка-радзіміцкай, фінскай і балцкай?
8. У чым змест новай канцэпцыі ўзнікнення Беларусі і беларусаў М. Піліпенкі?



Библиотека БГУИР

**Тэсты**

Выберыце правільны варыянт адказу

1. Назавіце храналагічныя рамкі даіндаеўрапейскага перыяду этнічнай гісторыі Беларусі:

а) 200 тыс. гг. да н.э. – 4 – 3 тыс. гг. да н.э.;

б) 70 тыс. гг. да н.э. – 3 – 2 тыс. гг. да н.э.;

в) 100 тыс. гг. да н.э. – 3 – 2 тыс. гг. да н.э.;

г) 40 тыс. гг. да н.э. – 3 – 2 тыс. гг. да н.э.

2. У якую эпоху каменнага веку адбылося поўнае засяленне чалавекам тэрыторыі сучаснай Беларусі?

а) у палеаліце;

б) у мезаліце;

в) у неаліце.

3. Назавіце храналагічныя рамкі індаеўрапейскага перыяду этнічнай гісторыі Беларусі:

а) 3 – 2 тыс. гг. да н.э. – да нашага часу;

б) 4 – 3 тыс. гг. да н.э. – да IX – X ст. н.э.;

в) 6 – 5 тыс. гг. да н.э. – да пачатку XX ст.;

г) 8 – 7 тыс. гг. да н.э. – да пачатку XIX ст.

4. Назавіце храналагічныя рамкі бронзавага веку, які прыйшоў на змену каменнага веку:

а) 3 – 2 тыс. гг. да н.э. – 1 тыс. гг. да н.э.;

б) 4 – 3 тыс. гг. да н.э. – 2 тыс. гг. да н.э.;

в) 6 – 5 тыс. гг. да н.э. – 3 тыс. гг. да н.э.;

г) 8 – 7 тыс. гг. да н.э. – 4 тыс. гг. да н.э.

5. Назавіце храналагічныя рамкі жалезнага веку, які змяніў бронзавы век:

а) 1 тыс. гг. да н.э. – IV – V стст. н.э.;

б) 2 тыс. гг. да н.э. – V – VI стст. н.э.;

в) 3 тыс. гг. да н.э. – VII – VIII стст. н.э.;

г) 4 тыс. гг. да н.э. – IX – X стст. н.э.

6. На якія тры часткі быў падзелены славянскі свет у VI ст.?

а) готы, гуны, кельты;

б) скіфы, сарматы, сакі;

в) венеды, склавіны, анты;

г) полаўцы, авары, аланы.

Літаратура

Гісторыя Беларусі : падручнік. У 2 ч. Ч. 1: Ад старажытных часоў – па люты 1917 г. / Пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. – Мінск : Выш. шк., 2007. –

Библиотека БГУИР

С. 17 – 42 (спіс літаратуры на с. 70).

Новік, Я. К. Гісторыя Беларусі. Ад старажытных часоў – па 2008 г. : вучэб. дапам. / Я. К. Новік, І. Л. Качалаў, Н. Я. Новік. – Мінск : Выш. шк., 2009. – С. 10 – 27.

Доўнар-Запольскі, М. В. Гісторыя Беларусі / М. В. Доўнар-Запольскі. – Мінск, 1994.

Ермаловіч, М. І. Старажытная Беларусь: Полацкі і Новагародскі перыяды / М. І. Ермаловіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1990.

Загарульскі, Э. М. Заходняя Русь. IX – XIII стст. / Э. М. Загарульскі. – Мінск : Універсітэцкае, 1998. – С. 58 – 177.

Пилипенко, М. Ф. Возникновение Белоруссии: Новая концепция / М. Ф. Пилипенко. – Минск : Беларусь, 1991. – С. 83 – 127.

<u>2-я заняткі</u>
<u>Беларускія землі ў перыяд станаўлення і развіцця феадальных адносін. Культура.</u>
<u>Увядзенне хрысціянства на беларускіх землях</u>

План

1. Полацкае і Тураўскае княствы – першыя раннефеадальныя княствы на тэрыторыі Беларусі.
2. Увядзенне хрысціянства на беларускіх землях.
3. Культура беларускіх зямель у IX – першай палове XIII ст.

Прыкладныя тэмы рэфератаў:

1. Жыццёвы шлях і асветніцкая дзейнасць Ефрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага.
2. Архітэктурныя збудаванні на тэрыторыі Беларусі XI – XIII стст.

**Пытанні і заданні для самападрыхтоўкі**

1. Назавіце і ахарактарызуйце тры групы прычын утварэння Старажытнарускай дзяржавы (Кіеўскай Русі).
2. У чым сутнасць летапіснага падання аб прызванні варагаў на Русь і нарманскай тэорыі ўтварэння Старажытнарускай дзяржавы?
3. Чаму нельга пагадзіцца са сцвярджэннямі некаторых гісторыкаў аб тым, быццам Старажытнарускай дзяржавы не існавала, быццам Кіеўская Русь – выдумка вучоных?
4. На якіх падставах Полацкае і Тураўскае княствы можна лічыць першымі раннефеадальнымі дзяржавамі-манархіямі на тэрыторыі Беларусі?
5. Чаму полацкія князі не маглі ўдзельнічаць у барацьбе за кіеўскі пасад і быць вялікімі кіеўскімі князямі?
6. Раскажыце аб найбольшай магутнасці Полацкага княства пры Усяславе Брачыславічу. Што вам вядома аб бітве на Нямізе ў 1067 г.?

Библиотека БГУИР

7. Чаму распалася Старажытнаруская дзяржава?

8. Якім было сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у IX – XIII стст.?

9. Калі і з якімі мэтамі з’явіліся крыжакі ў Прыбалтыцы, ля рускіх зямель?

10. Чаму Русь не змагла аб’яднаць сілы і даць арганізаваны адпор крыжакам і татара-манголам?

11. Якое значэнне мела ўвядзенне хрысціянства на беларускіх землях?

12. Ахарактарызуйце развіццё культуры на беларускіх землях у IX – XIII стст.

## Тэсты

Выберыце правільны варыянт адказу

1. Назавіце першыя раннефеадальныя дзяржавы-манархіі на тэрыторыі Беларусі:

а) Мінскае і Новагародскае княствы;
б) Друцкае і Віцебскае княствы;
в) Полацкае і Тураўскае княствы;
г) Лагойскае і Заслаўскае княствы.

2. Якому дзяржаўнаму органу належала заканадаўчая ўлада ў Полацкім княстве?

а) думе;
б) вечу;
в) сойму;
г) сенату.

3. Якія формы феадальнага землеўладання існавалі на беларускіх землях у IX – XIII стст.?

а) вотчыннае, паместнае, царкоўнае і манастырскае;
б) вотчыннае, дваранскае, купецкае;
в) паместнае, царкоўнае, сялянскае;
г) дзяржаўнае, сялянскае, іншаземнае.

4. Якія групы феадальна залежнага сялянства называюць крыніцы IX – XIII стст.?

а) смерды, закупы, халопы, рабы, радовічы, ізгоі;
б) смерды, цівуны, чэлядзінцы, каморнікі;
в) кутнікі, халопы, агароднікі, ізгоі;

5. Як называліся невялікія вёскі, дзе сяліліся сялянскія сем’і ў IX – XIII стст.?

а) весі;
б) гарадзішчы;
в) пагосты.

Библиотека БГУИР

6. Як называлася сялянская абшчына, у якую аб'ядноўвалася земляробчае насельніцтва?

а) вервь (мір);

б) дым;

в) рала.

7. Якія падначаленыя Полацку гарады-княствы існавалі на Заходняй Дзвіне ў XII – пачатку XIII стст.?

а) Ноўгарад і Пскоў;

б) Северск і Ізборск;

в) Кукенойс і Герцыке;

г) Рыга і Вільня.

8. Які год лічыцца пачаткам татара-мангольскага іга на Русі?

а) 1236 г.;

б) 1240 г.;

в) 1258 г.;

г) 1264 г.

9. Які кіеўскі князь хрысціў Русь?

а) Яраслаў Мудры;

б) Уладзімір Манамах;

в) Уладзімір Святаславіч;

г) Ігар Рурыкавіч.

10. Які храм быў пабудаваны ў Полацку ў сярэдзіне XI ст. следам за Кіевам і Ноўгарадам?

а) Благавешчанскі сабор;

б) Петрапаўлаўскі сабор;

в) Спаса-Праабражэнскі сабор;

г) Сафійскі сабор.

11. У якіх мясцінах Беларусі былі пабудаваны храмы ў XII ст.?

а) Магілёве, Бярэсці, Друцку, Лагойску;

б) Віцебску, Полацку, Бельчыцах, Новагародку;

в) Полацку, Будславе, Лідзе, Камянцы, Рагачове, Гомелі.

12. Назавіце прадстаўнікоў кніжнай асветы старажытнай Беларусі:

а) Сімяон Полацкі, Мілецій Сматрыцкі; Сымон Будны;

б) Васіль Цяпінскі, Францыск Скарына, Мікола Гусоўскі;

в) Клімент Смаляціч, Кірыла Тураўскі, Ефрасіння Полацкая.

Библиотека БГУИР

Літаратура

Гісторыя Беларусі : падручнік. У 2 ч. Ч. 1: Ад старажытных часоў – па люты 1917 г. / Пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. – Мінск: Выш. шк., 2007. – С. 42 – 68 (спіс літаратуры на с. 70).

Новік, Я. К. Гісторыя Беларусі. Ад старажытных часоў – па 2008 г. : вучэб. дапам. / Я. К. Новік, І. Л. Качалаў, Н. Я. Новік. – Мінск: Выш. шк., 2009. – С. 34 – 45, 49 – 57.

Гісторыя беларускага мастацтва: Ад старажытных часоў да другой паловы XVI ст.: У 6 т. Т. 1. – Мінск, 1987. – С. 10 – 60.

Арлоў, У. А. Еўфрасіння Полацкая / У. А. Арлоў. – Мінск, 1992.

Доўнар-Запольскі, М. В. Гісторыя Беларусі / М. В. Доўнар-Запольскі. – Мінск, 1994.

Загарульскі, Э. М. Заходняя Русь. IX – XIII стст. – Мінск , 1998. – С. 180 – 238.

Тарасаў, К. Памяць пра легенды: Постаці беларускай мінуўшчыны / К. Тарасаў. – Мінск, 1990.

## Тэма II. Беларускія землі ў складзе Вялікага Княства Літоўскага: ад Сярэднявечча – да Новага часу (другая палова XIII – першая палова XVI ст.)

(4 гадзіны)

1-я заняткі

Утварэнне і станаўленне Вялікага княства Літоўскага (другая палова XIII – першая палова XVI стст.)

План

1. Асаблівасці дзяржаўнага ладу ВКЛ.
2. Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у складзе ВКЛ.
3. Знешняя палітыка Вялікага Княства Літоўскага: асноўныя кірункі і прыярытэты.

Прыкладныя тэмы рэфератаў:

1. Тры Статуты Вялікага Княства Літоўскага – сістэматызаваныя агульнадзяржаўныя зборнікі законаў.
2. Палітычныя крызісы ў Вялікім княстве Літоўскім у 1341, 1377 і 1381 гг.
3. Востраўскае пагадненне 1392 г. як заканчэнне грамадзянскай вайны ў Вялікім Княстве Літоўскім.
4. Вялікі князь Вітаўт і яго дзяржаўна-палітычная дзейнасць.
5. Адносіны паміж Вялікім княствам Літоўскім і Маскоўскай дзяржавай у канцы XV – першай палове XVI стст.
6. Эвалюцыя паўнамоцтваў велікакняжацкай улады ў ВКЛ у другой палове XIII – першай палове XVI стст.
7. Паўстанне князя М. Глінскага 1508 г.

Библиотека БГУИР

## Пытанні і заданні для самападрыхтоўкі

1. Вылучыце сацыяльна-эканамічныя, унутрыпалітычныя і знешнепалітычныя перадумовы фарміравання ВКЛ.

2. Ахарактарызуйце асноўныя канцэпцыі ўтварэння ВКЛ.

3. Якія пункты погляду існуюць у вучоных адносна месцазнаходжання летапіснай Літвы? Растлумачце, чаму па гэтым пытанні вядуцца вострыя дыскусіі ў сучаснай гістарычнай навуцы.

4. Які князь быў пачынальнікам «збірання зямель ВКЛ»? Што Вы ведаеце пра першую сталіцу гэтай дзяржавы?

5. Якія князі ўнеслі найбольшы ўклад у пашырэнне і ўмацаванне ВКЛ і калі гэта было? Вызначце галоўныя вынікі іх дзейнасці.

6. Ахарактарызуйце шляхі ўваходжання беларускіх зямель у склад ВКЛ.

7. Што Вы ведаеце пра дынастычную і рэлігійную барацьбу ў дзяржаве? Што стала прычынай грамадзянскай вайны 1386 – 1392 гг? Чым яна закончылася?

8. Вызначце характар і наступствы грамадзянскай вайны 30-х гг. XV ст. у ВКЛ.

9. У чым гістарычнае значэнне правядзення цэнтралізатарскай палітыкі вялікімі князямі літоўскімі ва ўмовах поліэтнічнай дзяржавы?

10. Вызначце матывы, якія прымусілі тагачасных правіцеляў ВКЛ і Польскага каралеўства пайсці на заключэнне Крэўскай уніі.

11. Якія асноўныя напрамкі знешняй палітыкі ВКЛ можна вылучыць і якія падзеі адбываліся на кожным з гэтых напрамкаў?

12. Вызначце галоўную прычыну супрацьстаяння паміж ВКЛ і Вялікім Княствам Маскоўскім.

13. Ахарактарызуйце асноўныя вынікі знешнепалітычнай дзейнасці ВКЛ у XIV – XVI стст.

14. Ахарактарызуйце асаблівасці дзяржаўнага і саслоўнага ладу ВКЛ.

15. Прасачыце за эвалюцыяй велікакняжацкай улады ў ВКЛ у другой палове XIII – XVI ст.

16. Якія працэсы былі вызначальнымі ў сацыяльна-эканамічным развіцці ВКЛ? Да якіх вынікаў яны прывялі?

17. Якія змены адбываліся ў гарадскім кіраўніцтве пасля атрымання горадам магдэбургскага права?

### Тэсты

Выберыце правільны варыянт адказу

1. Імя першага вялікага князя ВКЛ:

а) Міндоўг;

б) Войшалк;

в) Віцень.

Библиотека БГУИР

2. Якая унія паклала пачатак рэалізацыі польска-літоўскага саюза ў 1385 г.?
а) Крэўская унія;
б) Берасцейская унія;
в) Гарадзельская унія.

3. Калі Вільня стала сталіцай ВКЛ?
а) 1253 г.;
б) 1323 г.;
в) 1332 г.

4. У якой бітве войскі ВКЛ і Польшчы разбілі крыжакоў і перапынілі іх паходы на сваю тэрыторыю?
а) Грунвальдская бітва;
б) Кулікоўская бітва;
в) Неўская бітва.

5. Хто з вялікіх князёў літоўскіх увёў інстытут намесніцтва ў ВКЛ?
а) Гедымін;
б) Вітаўт;
в) Казімір.

6. Хто з вялікіх князёў літоўскіх ураўняў праваслаўных з каталікамі ў эканамічных і асабістых правах?
а) Альгерд;
б) Жыгімонт Кейстутавіч;
в) Міндоўг.

7. Афіцыйная забарона праваслаўным займаць у ВКЛ вышэйшыя дзяржаўныя пасады была адменена ў:
а) 1563 г.;
б) 1522 г.;
в) 1529 г.

8. Грамадзянская вайна ў ВКЛ у часы вялікага князя Свідрыгайлы адбылася ў:
а) 1409 – 1411 гг.;
б) 1432 – 1436 гг.;
в) 1492 – 1494 гг.

9. Вайна паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай, падчас якой адбылася бітва пад Оршай, была ў:
а) 1492 – 1494 гг.;
б) 1500 – 1503 гг.;
в) 1512 – 1522 гг.



Библиотека БГУИР

10. Мяцеж князя Міхаіла Глінскага ў ВКЛ адбыўся ў:
а) 1508 г.;
б) 1506 г.;
в) 1510 г.

11. Як называліся ўласныя зямельныя ўладанні вялікага князя літоўскага?
а) гаспадарскі дамен;
б) спадчыннае трыманне;
в) памеснае трыманне.

12. Як называлася катэгорыя сялян, якія з'яўляліся поўнай уласнасцю феадалаў?
а) цяглыя сяляне;
б) служкі;
в) чэлядзь нявольная.

13. Які дакумент пачаў працэс юрыдычнага абгрунтавання прыгоннага права ў ВКЛ?
а) Судзебнік 1468 г.;
б) Прывілей 1447 г.;
в) Статут ВКЛ 1566 г.

14. Дакумент, які завяршыў запрыгоньванне сялян у ВКЛ:
а) «Устава на валокі» 1557 г.;
б) Статут ВКЛ 1566 г.;
в) Статут ВКЛ 1588 г.

15. Які горад у ВКЛ першым атрымаў права на самакіраванне (магдэбургскае права)?
а) Полацк;
б) Мінск;
в) Вільня.

Дакументы і матэрыялы:

Статут Великого Княжества Литовского 1588 г. – Минск, 1989 (Роздел первый. О персоне нашой господарской. Артыкулы 1, 2, 3, 17, 18, 29, 30. – С. 80 – 81, 90 – 91, 97 – 99; Роздел десятый. О пущу, о ловы, о дерево бортное, о озера и сенажати. Артыкулы 1, 2, 3. – С. 269 – 271; Роздел третийнадцать. О грабежах и о навезках. Артыкулы 1, 2, 3, 4. – С. 324 – 326; Роздел четвертыйнадцать. О злодействе всякого стану. Артыкулы 1, 2, 3. – С. 330 – 332).

Библиотека БГУИР

Літаратура

Гісторыя Беларусі : падручнік. У 2 ч. Ч. 1: Ад старажытных часоў – па люты 1917 г. / Пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. – Мінск : Выш. шк., 2007. – С. 72 – 128 (спіс літаратуры на с. 156).

Новік, Я. К. Гісторыя Беларусі. Ад старажытных часоў – па 2008 г. : вучэб. дапам. / Я. К. Новік, І. Л. Качалаў, Н. Я. Новік. – Мінск : Выш. шк., 2009. – С. 58 – 68, 78 – 97.

Вялікае Княства Літоўскае : энцыклапедыя. У 3 т. – Мінск, 2005 – 2010.

Кром, М. М. Меж Русью и Литвой. Западнорусские земли в системе русско-литовских отношений конца XV – первой трети XVI в. / М. М. Кром. – М., 1995.

Любавский, М. К. Очерк истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии включительно / М. К. Любавский. – М., 1910.

Насевіч В. Л. Пачаткі Вялікага Княства Літоўскага: падзеі і асобы / В. Л. Насевіч. – Мінск, 1993.

Пичета, В. И. Аграрная реформа Сигизмунда Августа в Литовско-Русском государстве / В. И. Пичета. – М., 1958.

## 2-я заняткі

## Фарміраванне беларускай народнасці. Культура Беларусі другой паловы XIII – першай паловы XVI стст.

План

1. Этнаўтваральныя фактары, агульныя прыкметы, працэс фарміравання і развіцця беларускай народнасці.
2. Развіццё і дасягненні культурнай сферы жыцця грамадства беларускіх земель у другой палове XIII – першай палове XVI стст.

Прыкладныя тэмы рэфератаў:

1. Асаблівасці эпохі Адраджэння ў Беларусі.
2. Беларуска-літоўскія летапісы як гістарычна-літаратурныя творы.
3. Беларусь сярэднявечча – «краіна замкаў».
4. Культавае будаўніцтва ў Беларусі ў XIII – XVI стст.
5. Ф. Скарына і яго дзейнасць.

### **Пытанні і заданні для самападрыхтоўкі**

1. Як адбываўся працэс фарміравання беларускай народнасці? Якія фактары садзейнічалі яму, а якія стрымлівалі?
2. Назавіце асаблівасці эпохі Адраджэння на беларускіх землях.
3. Назавіце асноўныя тэндэнцыі ў развіцці культуры на тэрыторыі Беларусі ў XIII – XVI стст. Чым яны былі абумоўлены?
4. У чым заключаецца гістарычнае значэнне дзейнасці Ф. Скарыны?

Библиотека БГУИР

5. Што вы ведаеце пра дзейнасць М. Гусоўскага?

6. Якія новыя літаратурныя жанры ўзніклі ў тую эпоху?

7. Які архітэктурны стыль заставаўся вядучым на тэрыторыі ВКЛ у XIII – пачатку XVI стст.?

8. Якія поспехі былі дасягнуты ў развіцці выяўленчага мастацтва на беларускіх землях у другой палове XIII – першай палове XVI стст.?

## Тэсты

Выберыце правільны варыянт адказу

1. Дзяржаўнай мовай у ВКЛ была:

а) лацінская мова;

б) старабеларуская мова;

в) польская мова.

2. Як называўся архіў ВКЛ?

а) Метрыка ВКЛ;

б) Скарб ВКЛ;

в) скрыпторый ВКЛ.

3. Які стыль панаваў у архітэктуры на тэрыторыі ВКЛ у XIII – пачатку XVI стст.?

а) класіцызм;

б) барока;

в) готыка.

4. Як называлася першая надрукаваная ў 1517 г. Ф. Скарынам кніга?

а) Апостал;

б) Псалтыр;

в) Малая падарожная кніжка.

5. Паэма Міколы Гусоўскага «Песня пра зубра» выйшла ў свет у:

а) 1517 г.;

б) 1522 г.;

в) 1535 г.

Літаратура

Гісторыя Беларусі : падручнік. У 2 ч. Ч. 1: Ад старажытных часоў – па люты 1917 г. / Пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. – Мінск : Выш. шк., 2007. – С. 128 – 151 (спіс літаратуры на с. 156).

Новік, Я. К. Гісторыя Беларусі. Ад старажытных часоў – па 2008 г. : вучэб. дапам./ Я. К. Новік, І. Л. Качалаў, Н. Я. Новік. – Мінск : Выш. шк., 2009. – С. 97 – 103.

Вялікае Княства Літоўскае: энцыклапедыя. У 3 т. – Мінск, 2005 – 2010.

Гісторыя беларускага мастацтва. У 6 т. Т. 2. – Мінск, 1988.



Библиотека БГУИР

Гісторыя беларускага тэатра. – Мінск, 1983.
Кушнярэвіч, А. М. Культавае дойлідства Беларусі XIII – XVI стст. / А. М. Кушнярэвіч. – Мінск, 1998.
Ткачев, М. А. Замки Беларуси / М. А. Ткачев. – 2-е изд. – Минск, 2005.
Францыск Скарына і яго час: энцыкл. давед. – Мінск, 1988.

## Тэма III. Беларусь у складзе Рэчы Паспалітай: Пачатак Новага часу ў айчыннай гісторыі (1569 – 1795 гг.)

(4 гадзіны)

1-я заняткі

Эканамічнае і палітычнае становішча беларускіх зямель у складзе Рэчы Паспалітай

План

1. Грамадска-палітычны лад Рэчы Паспалітай. Дзяржаўна-прававое становішча ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай.
2. Канфесійнае становішча ў ВКЛ. Рэфармацыя. Контррэфармацыя. Берасцейская царкоўная унія.
3. Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у складзе Рэчы Паспалітай.
4. Знешняя палітыка. Войны другой паловы XVI – XVIII стст.

Прыкладныя тэмы рэфератаў:

1. Дзейнасць каталіцкіх ордэнаў ў Беларусі.
2. Берасцейская царкоўная унія 1596 г. Уніяцкая царква.
3. Л. І. Сапега: жыццё і палітычная дзейнасць.
4. Правядзенне аграрнай рэформы ў Беларусі і яе вынікі.

### Пытанні і заданні для самападрыхтоўкі

1. Растлумачце прычыны, якія спрыялі ўтварэнню Рэчы Паспалітай.
2. Ці можна лічыць акт Люблінскай уніі пэўным кампрамісам паміж інтарэсамі і памкненнямі абодвух бакоў, што ішлі на яе заключэнне?
3. Ахарактарызуйце дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай.
4. Ахарактарызуйце дзяржаўна-прававое становішча ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай.
5. Ахарактарызуйце ролю, якую адыгралі праваслаўная царква і каталіцкі касцёл у грамадскім і духоўным жыцці зямель Беларусі.
6. Якія пратэстанцкія рухі атрымалі найбольшае пашырэнне ў ВКЛ у часы Рэфармацыі?
7. У чым заключаліся палітычныя і сацыяльныя асаблівасці Рэфармацыі ў ВКЛ?
8. Чым адрознівалася Контррэфармацыя ў ВКЛ ад Контррэфармацыі у



Библиотека БГУИР

краінах Заходняй Еўропы?

9. Як паўплывала Берасцейская унія на рэлігійнае і сацыяльнае жыццё беларусаў?

10. Вызначце асноўныя напрамкі знешняй палітыкі Рэчы Паспалітай ў другой палове XVI – XVIII стст.

11. Які ўплыў на Беларусь аказала вызваленчая вайна 1648 – 1654 гг. на Украіне?

12. Якія вынікі мелі для Беларусі войны XVII ст і Паўночная вайна?

13. Вызначце асаблівасці эканамічнага развіцця беларускіх зямель у другой палове XVI – XVIII стст. Якія этапы можна выдзеліць у гэтым працэсе?

14. Вызначце канчатковыя вынікі аграрнай рэформы 1557 г. і яе ўплыў на далейшае сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель.

15. Пералічыце асноўныя этапы юрыдычнага афармлення прыгонніцтва ў ВКЛ.

16. Якія фактары абумовілі фарміраванне ўнутранага рынку ВКЛ у XVI – XVIII стст.?

17. Прааналізуйце вытокі, праявы і вынікі палітычнага крызісу ў Рэчы Паспалітай.

18. Якія спробы рэформ дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай прадпрымаліся ў другой палове XVIII ст.?

**Тэсты**

Выберыце правільны варыянт адказу

1. У якім годзе была заключана Люблінская унія?
а)1560 г.;
б)1569 г.;
в)1558 г.

2. Калі было прынята рашэнне аб правядзенні кожнага трэцяга сейма Рэчы Паспалітай на тэрыторыі ВКЛ?
а) 1588 г.;
б) 1663 г.;
в) 1673 г.

3. Адна з прычын зацвярджэння Берасцейскай уніі:
а) будаўніцтва цэркваў-крэпасцей;
б) раскол хрысціянства;
в) імкненне пашырыць уплыў каталіцызму.

4. У якім годзе была заключана Берасцейская унія?
а)1596 г.;
б)1597 г.;
в)1586 г.

Библиотека БГУИР

5. Назва нацыянальна-рэлігійных арганізацый праваслаўнага насельніцтва, якія ўзніклі ў ВКЛ у канцы XVI – пачатку XVII стст.:

а) калегіумы;

б) брацтвы;

в) зборы.

6. Рух, пад уплывам ідэй якога ўзніклі пратэстанцкія зборы ў ВКЛ:

а) Рэфармацыя;

б) Контррэфармацыя;

в) Асветніцтва.

7. У якім годзе Жыгімонт Ваза распачаў адкрытую інтэрвенцыю супраць Расіі?

а)1602 г.;

б)1600 г.;

в)1609 г.

8. У якім годзе было заключана Андрусаўскае перамір’е?

а)1654 г.;

б)1667 г.;

в)1700 г.

9. Асадныя сяляне гэта:

а) сяляне, якія адпрацоўвалі паншчыну;

б) сяляне, якія плацілі грашовы падатак;

в) сяляне, якія не выконвалі павіннасцей.

10. Якая новая група сялян узнікла пасля рэформы 1557 г.?

а) цяглыя;

б) чэлядзь нявольная;

в) агароднікі.

11. «Чатырохгадовы сейм» праходзіў у:

а) 1764 – 1768 гг.;

б) 1788 – 1792 гг.;

в) 1786 – 1790 гг.

12. Што такое Галоўны Трыбунал?

а) вышэйшая судовая ўстанова ВКЛ;

б) канцылярыя ВКЛ;

в) скарб ВКЛ.

13. Падзелы Рэчы Паспалітай адбыліся ў:

а) 1772, 1793, 1795 гг.;



Библиотека БГУИР

б) 1771, 1791, 1793 гг.;
в) 1700, 1721, 1741 гг.

14. Якая краіна не ўдзельнічала ў другім падзеле Рэчы Паспалітай?
а) Расія;
б) Аўстрыя;
в) Прусія.

15. 3 мая 1791 г. была прынята:
а) пастанова аб другім падзеле Рэчы Паспалітай;
б) пастанова аб скасаванні прыгоннага права ў Рэчы Паспалітай;
в) канстытуцыя Рэчы Паспалітай.

16. Кіраўніком паўстанцаў на беларускіх землях пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай стаў:
а) Тадэвуш Касцюшка;
б) Якуб Ясінскі;
в) Сымон Касакоўскі.

Дакументы і матэрыялы:

Статут Великого Княжества Литовского 1588 г. – Минск, 1989, (Роздел третий. О волностях шляхетских и о розмноженью Великого князства Литовского. Артыкулы 1, 2, 3, 5, 12, 13, 32. – С. 111 – 116, 118 – 119, 127 – 129).

Літаратура

Гісторыя Беларусі : падручнік. У 2 ч. Ч. 1: Ад старажытных часоў – па люты 1917 г. / Пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. – Мінск : Выш. шк., 2007. – С. 166 – 218 (спіс літаратуры на с. 244).

Новік, Я. К. Гісторыя Беларусі. Ад старажытных часоў – па 2008 г. : вучэб. дапам. / Я. К. Новік, І. Л. Качалаў, Н. Я. Новік. – Мінск : Выш. шк., 2009. – С. 108 – 139.

Блинова, Т. Иезуиты в Белоруссии / Т. Блинова. – Минск, 1990.

Голубеў, В. Ф. Сялянскае землеўладанне і землекарыстанне на Беларусі XVI – XVIII стст. / В. Ф. Голубеў. – Мінск, 1992.

Грицкевич, А. П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI–XVIII вв. / А. П. Грицкевич. – Минск, 1975.

Дмитриев, М. В. Православие и реформация. Реформационные движения в восточнославянских землях Речи Посполитой во второй половине XVI в. / М. В. Дмитриев. – М., 1990.

Саверчанка, І. В. Канцлер ВКЛ Леў Сапега / І. В. Саверчанка. – Мінск, 1992.

Библиотека БГУИР

2-я заняткі

Развіццё беларускай культуры ў другай палове XVI – канцы XVIII стст.

План

1. Асвета і кнігадрукаванне. Бібліятэчная і архіўная справа.
2. Грамадска-палітычная думка і літаратура.
3. Тэатральна-музычнае мастацтва.
4. Выяўленчае мастацтва і архітэктура.

Прыкладныя тэмы рэфератаў:

1. Баркулабаўская хроніка – выдатны твор летапісання XVII ст.
2. Прыватныя тэатры ў Беларусі.
3. Абарончыя і культавыя збудаванні другой паловы XVI – XVIII стст. у Беларусі.
4. Палацы і палацава-паркавыя ансамблі другой паловы XVI – XVIII стст. у Беларусі.

## Пытанні і заданні для самападрыхтоўкі

1. Ахарактарызуйце гістарычныя ўмовы развіцця і галоўныя здабыткі культуры зямель Беларусі ў другой палове XVI – XVIII ст.

2. Калі завяршаецца эпоха Адраджэння на беларускіх землях? Якімі былі яе вынікі?

3. Як паўплывалі на развіццё літаратуры працэсы, што адбываліся ў грамадска-палітычным жыцці краіны?

4. Як развівалася архіўная справа на беларускіх землях у другой палове XVI – XVIII ст?

5. Што Вы ведаеце пра «сармацкі стыль» у выяўленчым мастацтве? З чым звязана яго з'яўленне?

6. Які архітэктурны стыль становіцца вядучым у азначаны перыяд і чаму?

7. Пералічыце асаблівасці эпохі Асветніцтва ў Беларусі.

8. Ахарактарызуйце ролю рэлігійных арганізацый у развіцці адукацыі на беларускіх землях.

## Тэсты

Выберыце правільны варыянт адказу

1. Школы, у якіх індывідуальнае навучанне замянялася класна-ўрочным называліся:

а) арыянскія;
б) кальвінісцкія;
в) брацкія.

2. Багацейшай у Рэчы Паспалітай з'яўлялася бібліятэка:

Библиотека БГУИР

а) нясвіжская Радзівілаў;
б) бібліятэка Храптовіча;
в) бібліятэка Тызенгаўза.

3. Батлейка гэта:
а) музычны інструмент;
б) тэатр лялек;
в) нотны зборнік.

4. Знакамітыя на ўвесь свет паясы ткалі:
а) у Нясвіжы;
б) у Міры;
в) у Слуцку.

5. У 1696 г. у гісторыі ВКЛ адбылося:
а) забарона афіцыйнага ўжывання беларускай мовы;
б) заканчэнне Інфлянцкай (Лівонскай) вайны;
в) падпісанне Брэсцкай царкоўнай уніі.

6. Позні этап развіцця барочнага архітэктурнага стылю на беларускіх землях атрымаў назву:
а) несапраўднае барока;
б) нясвіжскае барока;
в) віленскае барока.

7. Антыфеадальная буржуазная ідэалогія перыяду станаўлення капіталістычных адносін, якая сцвярджала прыярытэт асветы, навукі і розуму ў жыцці асобы, грамадства і дзяржавы, гэта:
а) Адраджэнне;
б) Асветніцтва;
в) Рэфармацыя.

8. Найбольш старажытны прыватны тэатр ў Беларусі быў у:
а) Нясвіжы;
б) Ружанах;
в) Свіслачы.

9. Літаратурны жанр, прысвечаны актуальным праблемам грамадскага жыцця, напісаны ў форме дыскусіі або вострай спрэчкі і, як правіла, ананімна – гэта:
а) гісторыка-мемуарны жанр;
б) драматургічны жанр;
в) палемічная публіцыстыка.

Библиотека БГУИР

Літаратура

Гісторыя Беларусі : падручнік. У 2 ч. Ч. 1: Ад старажытных часоў – па люты 1917 г. / Пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. – Мінск : Выш. шк., 2007. – С. 218 – 240 (спіс літаратуры на с. 244).

Новік, Я. К. Гісторыя Беларусі. Ад старажытных часоў – па 2008 г. : вучэб. дапам. / Я. К. Новік, І. Л. Качалаў, Н. Я. Новік. – Мінск : Выш. шк., 2009. – С. 144 – 158.

Гісторыя беларускага мастацтва. У 6 т. Т. 2. – Мінск, 1988.

Гісторыя беларускага тэатра. У 3 т. Т. 1. – Мінск, 1983.

Дадзіёмава, В. Музычнае мастацтва Беларусі ў эпоху Рэнесансу і барока / В. Дадзіёмава // Мастацтва. – 1997. – №5. – С. 35 – 38.

Мазуркевіч, В. П. Адукацыя ў Беларусі ў XVI–XVIII стст. / В. П. Мазуркевіч // Народная асвета. – 1997. – №11. – С. 151 – 156.

Ткачоў, М. А. Замкі і людзі / М. А. Ткачоў. – Мінск, 1991.

Шалькевіч, В. Ф. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі : вучэб. дапам. / В. Ф. Шалькевіч. – Мінск, 1999.

## Тэма IV. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (1795 – люты 1917 г.)

(4 гадзіны)

1-я заняткі

Буржуазныя рэформы ў Расійскай імперыі і асаблівасці іх правядзення ў Беларусі

План

1. Асаблівасці адмены прыгоннага права і правядзення рэформ 60 – 70-х гг. XIX ст. у Беларусі.
2. Парэформеннае развіццё беларускіх губерняў.
3. Змены ў краіне, выкліканыя першай расійскай рэвалюцыяй 1905 – 1907 гг. Сталыпінскія рэформы.

Прыкладныя тэмы рэфератаў:

1. П. А. Сталыпін і Беларусь.
2. Беларускія губерні ў эканоміцы Расіі напярэдадні Першай сусветнай вайны.
3. Станаўленне прамысловасці ў Беларусі.
4. Прамысловасць Беларусі ў пачатку XX стагоддзя.
5. Развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы Беларусі.
6. Спецыялізацыя сельскай гаспадаркі беларускіх губерняў.

### Пытанні і заданні для самападрыхтоўкі

1. Якія асноўныя прычыны абумовілі адмену прыгоннага права ў Расійскай імперыі?



Библиотека БГУИР

2. Чым былі выкліканы асаблівасці правядзення сялянскай рэформы 1861 г. у розных рэгіёнах Беларусі?

3. Якім чынам паўстанне 1863 – 1864 гг. паўплывала на правядзенне сялянскай і іншых буржуазных рэформ 60 – 70-х гг. XIX ст. у беларускіх губернях?

4. Як рэформы 60 – 70-х гг. і контррэформы 80-х гг. XIX ст. адбіліся на сельскагаспадарчай і прамысловай вытворчасці Беларусі і сацыяльным складзе яе насельніцтва?

5. Якія змены адбыліся ў спецыялізацыі сельскай гаспадаркі і прамысловасці Беларусі пасля адмены прыгоннага права і да пачатку XX ст.?

6. Якую ролю адыграў чыгуначны і рачны транспарт у развіцці сельскагаспадарчай і прамысловай вытворчасці Беларусі ў 60-я гады XIX ст. – першыя гады XX ст.?

7. Калі пачалася і якія асаблівасці мела імперыялістычная стадыя капіталізму ў эканоміцы Беларусі?

8. З чаго складаліся, як праводзіліся і якія вынікі мелі сталыпінскія рэформы ў Беларусі?

## Тэсты

Выберыце правільны варыянт адказу

1. «Сакрэтны камітэт для абмеркавання мер па ўладкаванні побыту памешчыцкіх сялян», створаны ў студзені 1857 г., павінен быў:

а) абмяркоўваць умовы адмены прыгоннага права;

б) распрацоўваць тэксты закона аб адмене прыгоннага права;

в) распрацоўваць праект закона аб адмене прыгоннага права;

г) распрацоўваць ваенныя мерапрыемствы па прадухіленню ўсеагульнага сялянскага паўстання.

2. Якія прапановы ў адрас урада пры падрыхтоўцы сялянскай рэформы выказалі памешчыкі Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губерняў?

а) вызваліць сялян з прадстаўленнем ім зямлі без выкупу;

б) вызваліць сялян без зямлі;

в) наогул не вызваляць сялян;

г) даць сялянам права прыватнай уласнасці на зямлю, але асабістай свабоды не даваць.

3. Асноўным абавязкам міравых пасрэднікаў было садзейнічанне:

а) у правядзенні люстрацыі сялянскага землеўладання;

б) у складанні ўстаўных грамат;

в) у абмеркаванні ўмоў адмены прыгоннага права;

г) у распрацоўцы праекта закона аб адмене прыгоннага права.



Библиотека БГУИР

4. Устаўная грамата – гэта дакумент, у якім:

а) вызначаліся пазямельныя адносіны сялян і памешчыкаў у дарэформенны перыяд;

б) змяшчаліся прынцыпы адмены прыгоннага права ў асобных рэгіёнах Расійскай імперыі;

в) змяшчаліся разлікі памераў выкупных плацяжоў для кожнага сялянскага надзела;

г) вызначаліся пазямельныя адносіны сялян і памешчыкаў у парэформенны перыяд.

5. З буржуазных рэформ у 60 – 70-я гг. XIX ст. у Беларусі зусім не праводзілася:

а) ваенная;

б) гарадская;

в) земская;

г) судовая;

д) школьная.

6. Да сельскагаспадарчага крызісу 1880-х гг. вядучай галіной сельскай гаспадаркі беларускіх губерняў было:

а) вырошчванне збожжа (жыта, авёс, ячмень);

б) мяса-малочная жывёлагадоўля;

в) бульбаводства (з далейшай перапрацоўкай бульбы на спірт);

г) вырошчванне тэхнічных культур (бульбы, ільну, канапель, рапсу).

7. У 90-я гады XIX ст. галоўнай спецыялізаванай галіной у сельскай гаспадарцы Беларусі стала:

а) вырошчванне збожжа (жыта, авёс, ячмень);

б) мяса-малочная жывёлагадоўля;

в) бульбаводства (з далейшай перапрацоўкай бульбы на спірт);

г) вырошчванне тэхнічных культур (бульбы, ільну, канапель, рапсу).

8. Якая першая чыгунка была пракладзена праз тэрыторыю Беларусі?

а) Маскоўска-Брэсцкая;

б) Пецярбургска-Варшаўская;

в) Лібава-Роменская;

г) Рыга-Арлоўская.

9. Сталыпінская аграрная рэформа прадугледжвала:

а) разбурэнне сялянскай абшчыны, стварэнне ў вёсцы шырокай праслойкі эканамічна самастойных заможных сялян, перасяленне сялян на хутары і адрубы, перасяленне сялян у іншыя рэгіёны імперыі;

б) захаванне сялянскай абшчыны, дапамога бедным сялянскім гаспадаркам, перасяленне багатых сялян на хутары і адрубы, перасяленне сялян у іншыя рэгіёны імперыі;

Библиотека БГУИР

в) разбурэнне сялянскай абшчыны, дапамога найбольш бедным сялянскім сем’ям, перасяленне сялян на хутары і адрубы, перасяленне сялян у іншыя рэгіёны імперыі;

г) захаванне сялянскай абшчыны, стварэнне ў вёсцы шырокай праслойкі эканамічна самастойных заможных сялян, перасяленне бедных сялянскіх сем’яў на хутары і адрубы, перасяленне сялян у іншыя рэгіёны імперыі.

Дакументы і матэрыялы:

1. 1893 г. – Статистические сведения о количестве фабрично-заводских предприятий, паровых машин на них и рабочих в пяти западных губерниях // Белоруссия в эпоху капитализма: сб. документов и материалов. Т. 2. – Минск, 1990. – С. 118 – 122.
2. 1903 г. – Статистические сведения о распределении железнодорожной сети по пяти западным губерниям // Белоруссия в эпоху капитализма: сб. документов и материалов. Т. 2. – Минск, 1990. – С. 183.
3. 1903 г. – Статистические сведения о протяженности внутренних водных путей пяти западных губерний // Белоруссия в эпоху капитализма: сб. документов и материалов. Т. 2. – Минск, 1990. – С. 183.
4. 1895 г. – Сообщение газеты «Минский листок» о положении рабочих на спичечной фабрике «Виктория» в г. Борисове // Белоруссия в эпоху капитализма: сб. документов и материалов. Т. 2. – Минск, 1990. – С. 199 – 200.
5. 1863 г. – Из обзора МВД об обнародовании манифеста – крестьянских волнениях с 1 января 1861 по 19 февраля 1861 г. // Хрестоматия по истории Белоруссии. – Минск, 1977. – С. 281 – 286.
6. 1860–1869 гг. – Из отчетов губернаторов о состоянии промышленности и торговли в Белоруссии // Хрестоматия по истории Белоруссии. – Минск, 1977. – С. 298 – 300.

Літаратура

Гісторыя Беларусі : падручнік. У 2 ч. Ч. 1: Ад старажытных часоў – па люты 1917 г. / Пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. – Мінск : Выш. шк., 2007. – С. 297 – 323. (спіс літаратуры на с. 296; 392 – 394).

Новік, Я. К. Гісторыя Беларусі. Ад старажытных часоў – па 2008 г. : вучэб. дапам. / Я. К. Новік, І. Л. Качалаў, Н. Я. Новік. – Мінск : Выш. шк., 2009. – С. 201 – 208, 215 – 251.

Бейлькин, Х. Ю. Сельскохозяйственный рынок Белоруссии. 1861 – 1914 гг. / Х. Ю. Бейлькин. – Минск, 1989.

История рабочего класса Белорусской ССР. В 4 т. Т. 1. – Минск, 1984.

Панютич, В. П. Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861 – 1900 гг. / В. П. Панютич. – Минск, 1990.

Сталыпінская аграрная рэформа і яе ажыццяўленне на Беларусі // З гісторыі эканамічных рэформаў на Беларусі : метад. зб. Вып. 1. – Мінск, 1994.

Библиотека БГУИР

Шыбека, З. В. Мінск: Старонкі жыцця дарэвалюцыйнага горада / З. В. Шыбека, С. Ф. Шыбека. – Мінск, 1994.

Эканамічная гісторыя Беларусі : вуч. дапам. / Пад рэд. В. І. Галубовіча. 3-е выд., дап. і перапрац. – Мінск, 1999. – С. 151 – 209.

## 2-я заняткі
## Грамадска-палітычнае жыццё беларускіх губерняў у сярэдзіне XIX – пачатку XX стст.

План

1. Паўстанне 1863 – 1864 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі, яго ўплыў на грамадска-палітычнае развіццё беларускіх губерняў.
2. Фарміраванне беларускай нацыі.
3. Фарміраванне беларускага нацыянальнага руху. Асноўныя рысы нацыянальна-культурнага адраджэння Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX стст.

Прыкладныя тэмы рэфератаў:

1. Жыццёвы лёс і фарміраванне палітычных поглядаў К. Каліноўскага.
2. Браты А. і І. Луцкевічы, іх роля ў развіцці беларускага нацыянальнага руху.
3. Грамадска-палітычная дзейнасць газеты «Наша Ніва».
4. Дзяржаўная Дума ў Расіі і грамадска-палітычны рух на Беларусі.
5. Развіццё адукацыі на Беларусі ў XIX ст.
6. Беларуская літаратура і нацыянальнае адраджэнне.
7. Пачатак навуковага беларусазнаўства.

### Пытанні і заданні для самападрыхтоўкі

1. Растлумачце сутнасць пазіцыі «чырвоных» і «белых» у паўстанні 1863 – 1864 гг.
2. Ахарактарызуйце ўдзел розных пластоў насельніцтва беларускіх губерняў у паўстанні 1863 – 1864 гг. Чаму так адбывалася?
3. З чаго пачынаўся і якімі арганізацыямі быў прадстаўлены беларускі нацыянальны рух у пачатку XX ст.?
4. Што абумовіла ўзнікненне і актывізацыю дзейнасці на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. палітычных партый і арганізацый з яўна акрэсленай нацыянальна-рэлігійнай арыентацыяй?
5. Назавіце першыя беларускія палітычныя партыі.
6. Якую стратэгію і тактыку абралі для сябе розныя палітычныя партыі і арганізацыі, што дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі, ва ўмовах Першай сусветнай вайны?
7. Як развіваўся беларускі нацыянальны рух у гады Першай сусветнай вайны?

Библиотека БГУИР

8. Якія змены ў грамадска-палітычнай сітуацыі на Беларусі выклікала перамога Лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі 1917 г. у Петраградзе?

9. Якія асаблівасці меў працэс станаўлення беларускай нацыі ў другой палове XIX ст. – пачатку XX ст.?

10. Як нацыянальны склад насельніцтва Беларусі адбіўся на працэсе фарміравання сацыяльнай структуры буржуазнага грамадства?

11. Якую ролю ў станаўленні беларускай нацыі адыгралі навуковае беларусазнаўства, мастацкая літаратура і перыядычны друк?

## Тэсты

Выберыце правільны варыянт адказу

1. Правыя «чырвоныя» ў паўстанні 1863 – 1864 гг.

а) прызнавалі права на нацыянальнае самавызначэнне літоўцаў, украінцаў і беларусаў;

б) прызнавалі роўнасць нацыянальных правоў беларусаў, літоўцаў, украінцаў з палякамі, але выступалі за адзіную незалежную Польшчу ў межах 1772 г.;

в) аграрнае пытанне планавалі вырашыць шляхам ліквідацыі памешчыцкага землеўладання;

г) разлічвалі на сялянскую рэвалюцыю і саюз з расійскімі рэвалюцыянерамі.

2. У газеце «Мужыцкая праўда» не было заклікаў да:

а) узброенай барацьбы з самадзяржаўем;

б) падтрымкі польскага нацыянальна-вызваленчага руху;

в) барацьбы з праваслаўнай царквой;

г) інтэрнацыянальнай еднасці беларускага і рускага народаў.

3. Беларуская сацыялістычная грамада падчас рэвалюцыі 1905 – 1907 гг. найбольш актыўна дзейнічала ў асяроддзі:

а) рамеснікаў і рабочых беларускіх гарадоў;

б) беларускіх сялян;

в) салдат у вайсковых гарнізонах Беларусі.

4. Пасля заканчэння першай расійскай рэвалюцыі Беларуская сацыялістычная грамада як палітычная партыя:

а) перайшла на нелегальнае становішча;

б) прыпыніла сваю дзейнасць;

в) перастала існаваць увогуле;

г) злілася з партыяй эсэраў.

5. Характар дзейнасці газеты «Наша Ніва» можна вызначыць як:

а) рэвалюцыйна-прапагандысцкі;

б) афіцыйна-інфармацыйны;

в) ліберальна-асветніцкі;

г) адкрыта-апазіцыйны.



Библиотека БГУИР

6. Беларускі народны камітэт – гэта:

а) каардынацыйны орган беларускіх палітычных і грамадскіх арганізацый, які дзейнічаў на тэрыторыі Беларусі, акупаванай Германіяй;

б) тайная арганізацыя, якая была створана для каардынацыі рэвалюцыйнай дзейнасці сярод бежанцаў-беларусаў у гарадах цэнтральнай Расіі;

в) каардынацыйны орган беларускіх нацыяналістаў, якія падчас Першай сусветнай вайны выступілі за стварэнне на тэрыторыі Беларусі незалежнай дзяржавы.

7. Беларуская нацыянальная буржуазія ў канцы XIX – пачатку XX ст. была пераважна:

а) прамысловай;
б) гандлёвай;
в) банкаўскай;
г) сельскагаспадарчай.

8. Аснову беларускай літаратурнай мовы склалі:
а) паўночнабеларускія гаворкі;
б) усходнебеларускія гаворкі;
в) сярэднебеларускія гаворкі;
г) заходнебеларускія гаворкі;
д) паўднёвабеларускія гаворкі.

9. Першай легальнай недзяржаўнай газетай у Беларусі была:
а) Мужыцкая праўда;
б) Віленскі веснік;
в) Гоман;
г) Губернские ведомости;
д) Епархиальные ведомости:
е) Минский листок;
ж) Наша доля.

10. У бытавым жанры мастацтва (канец XIX ст.) спецыялізаваўся:
а) А. Гараўскі;
б) Н. Сілівановіч;
в) К. Альхімовіч;
г) В. Бялыніцкі-Біруля.

11. У гістарычным жанры мастацтва (канец XIX ст.) спецыялізаваўся:
а) А. Гараўскі;
б) Н. Сілівановіч;
в) К. Альхімовіч;
г) В. Бялыніцкі-Біруля.

Библиотека БГУИР

12. З сярэдзіны XIX ст. на змену класіцызму ў архітэктуры Беларусі прыходзіць:

а) рамантызм;
б) готыка;
в) барока;
г) эклектыка.

Дакументы і матэрыялы:


1. Каліноўскі, К. За нашу вольнасць: творы, дакументы / К. Каліноўскі / скл. Г. Кісялёў. – Мінск, 1999.
2. 1863 г. 26 апреля – Донесение Б. К. Рейхарта В. А. Долгорукову о действиях польских повстанческих отрядов в Минской губ. // Хрестоматия по истории Белоруссии. – Минск, 1977. – С. 287 – 288.
3. 1863 г. июня … – Из «Мужыцкай праўды» обращение К. Калиновского к белорусским крестьянам – призыв становиться в ряды борцов за свободу и справедливость // Хрестоматия по истории Беларуси. – Минск, 1977. – С. 289 – 290.
4. Маніфест 17 кастрычніка 1905 года // Беларускі гістарычны часопіс. – 1995. – № 1. – С. 82.
5. Программа Белорусской Социалистической Громады // Октябрь 1917 и судьбы политической оппозиции. В 3 ч. Ч. 2: У истоков политического противостояния. – Гомель, 1993. – С. 14 – 16.
6. Луцкевіч, А. За двадцать пяць гадоў (1903 – 1928): Успаміны аб працы першых палітычных арганізацый / А. Луцкевіч. – Мінск, 1991.
7. 1897 г. – Из материалов первой всеобщей переписи населения России о грамотности населения по сословиям // Хрестоматия по истории Белоруссии. – Минск, 1977. – С. 424 – 428.
8. 1910 г. – Из отчета Виленского губернатора – об оппозиционных настроениях в среде народных учителей // Хрестоматия по истории Белоруссии. – Минск, 1977. – С. 429 – 430.
9. О количестве учебных заведений в городах белорусских губерний // Хрестоматия по истории Белоруссии. – Минск, 1977. – С. 430 – 431.
10. 1913 г. 6 октября – Из рапорта помощников правителя канцелярии Минского губернатора минскому губернатору – о ревизии минской городской публичной библиотеки им. А.С. Пушкина // Хрестоматия по истории Белоруссии. – Минск, 1977. – С. 431 – 432.


Літаратура


Гісторыя Беларусі : падручнік. У 2 ч. Ч. 1: Ад старажытных часоў – па люты 1917 г. / Пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. – Мінск : Выш. шк., 2007. – С. 323 – 350, 369 – 374 (спіс літаратуры на с. 392 – 394).


Библиотека БГУИР

Новік, Я. К. Гісторыя Беларусі. Ад старажытных часоў – па 2008 г. : вучэб. дапам. / Я. К. Новік, І. Л. Качалаў, Н. Я. Новік. – Мінск : Выш. шк., 2009. – С. 208 – 214, 237 – 241, 251 – 257, 261 – 263, 271 – 275.

Арлоў, У. А. Прысуд выканаў невядомы: Ігнат Грынявіцкі / У. А. Арлоў. – Мінск, 1992.

Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. – Мінск, 1993.

Гісторыя беларускага мастацтв. У 6 т. Т. 3. – Мінск, 1983.

Гісторыя беларускага тэатра. У 3 т. Т. 1. – Мінск, 1983.

Дробов, Л. Н. Живопись Беларуси XIX – начала XX вв. / Л. Н. Дробов. – Минск, 1974.

З гісторыі палітычных партый : вуч. дапам. для студэнтаў. – Мінск, 1993.

Сташкевіч, М. Перадумовы і працэс стварэння палітычных партый на Беларусі (канец XIX ст. – люты 1917 г.) / М. Сташкевіч // Беларускі гістарычны часопіс. – 1999. – № 3 – 4.

Чантурия, В. А. История архитектуры Белоруссии: Дооктябрьский период. В 2 т. / В. А. Чантурия. – Минск, 1985.

## Тэма V. Падзеі Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Беларусі. Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва. Грамадзянская вайна і іншаземная інтэрвенцыя: Пачатак Найноўшага часу ў айчыннай гісторыі (люты 1917 – 1920 г.)

(4 гадзіны)

1-я заняткі

Падзеі Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Беларусі

План

1. Абвастрэнне сацыяльна-эканамічнага і палітычнага крызісу ў краіне пасля Лютаўскай рэвалюцыі. Уздым беларускага нацыянальнага руху.
2. Устанаўленне савецкай ўлады ў Беларусі.
3. Размежаванне палітычных сіл у Беларусі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. I Усебеларускі з’езд (снежань 1917 г.).

Прыкладныя тэмы рэфератаў:

1. Першыя рэвалюцыйныя пераўтварэнні ў Беларусі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі.
2. Роля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. ва ўсталяванні савецкага грамадства.

### Пытанні і заданні для самападрыхтоўкі

1. Ахарактарызуйце эканамічную і палітычную сітуацыю ў Расіі пасля Лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі 1917 г., асаблівасці яе праяўлення ў Беларусі.
2. Пакажыце, як выспела сацыялістычная рэвалюцыя?

Библиотека БГУИР

3. Як разгортваліся падзеі Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. у Беларусі?

4. Якія новыя органы ўлады былі створаны ў Беларусі пасля перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі?

5. Якую пазіцыю ў дачыненні Кастрычніцкай рэвалюцыі занялі беларускія нацыянальныя арганізацыі і партыі?

6. З якой мэтай быў скліканы І Усебеларускі з'езд? Чаму ён быў разагнаны?

## Тэсты

Выберыце правільны варыянт адказу

1. Калі ў Расіі скончылася двоеўладдзе?

а) красавік 1917 г.;
б) ліпень 1917 г.;
в) жнівень 1917 г.;
г) кастрычнік 1917 г.

2. На аснове якога дакумента ўлада ў Мінску перайшла да Мінскага Савета?

а) дэкрэта аб уладзе;
б) загада № 1 Прэзідыума выканкама Мінскага Савета;
в) маніфеста Часовага ўрада.

3. Калі ў Мінску ў 1917 г. канчаткова перамагла Кастрычніцкая рэвалюцыя?

а) 26 кастрычніка;
б) 1 лістапада;
в) 25 лістапада;
г) 15 снежня.

4. Каму належала ў Мінску рэальная ўлада на працягу тыдня з 27 кастрычніка 1917 г.?

а) Мінскаму Савету рабочых і салдацкіх дэпутатаў;
б) Ваенна-рэвалюцыйнаму камітэту Паўночна-Заходняга фронту;
в) Камітэту выратавання рэвалюцыі;
г) Часоваму грамадскаму камітэту парадку;
д) Вялікай беларускай радзе.

5. Хто стварыў «Камітэт выратавання рэвалюцыі» ў Мінску ў кастрычніку 1917 г.?

а) бальшавікі;
б) Беларуская сацыялістычная грамада;
в) прадстаўнікі франтавога камітэта, якія не прызнавалі ўлады Саветаў.

6. Якія арганізацыі заахвочвалі савецкія ўлады да вырашэння пытання беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове?



Библиотека БГУИР

а) Аблвыкамзах;

б) Белнацкам;

в) Ваенна-рэвалюцыйны камітэт Паўночна-Заходняга фронту;

г) Беларускія камуністычныя секцыі;

д) Беларуская сацыялістычная грамада.

7. Аблвыкамзах з’яўляўся:

а) часовым органам кіравання ў перыяд пераходу ўлады да Саветаў у Беларусі;

б) вышэйшым заканадаўчым органам савецкай улады ў Беларусі з лістапада 1917 г.;

в) органам улады на Заходнім фронце;

г) ваенным органам улады.

8. Усебеларускі з’езд, які адбыўся ў 1917 г. прыняў рашэнне аб:

а) скліканні Устаноўчага сходу;

б) абвяшчэнні БНР;

в) абвяшчэнні ССРБ;

г) стварэнні органа краёвай улады ў выглядзе Усебеларускага Савета.

9. Пазіцыя БСГ па нацыянальным пытанні летам 1917 г.:

а) стварэнне незалежнай беларускай дзяржавы;

б) стварэнне Заходняй камуны;

в) культурна-нацыянальная аўтаномія Беларусі ў складзе Расійскай дэмакратычнай рэспублікі;

г) падтрымка Усерасійскага Устаноўчага сходу.

10. Дата I Усебеларускага з’езда:

а) 24 – 25 кастрычніка 1917 г.;

б) 15 лістапада 1917 г.;

в) 15 – 18 снежня 1917 г.;

г) 5 студзеня 1918 г.

Дакументы і матэрыялы:

1. Воззвание II Всероссийского съезда Советов «Рабочим, солдатам и крестьянам!», написанное В. И. Лениным. 25 октября 1917 г. // Ленин В. И. Полн. собр. соч. Т.35. – С. 11 – 12.

2. Приказ № 1 Исполкома Минского Совета о переходе всей власти в руки Советов. 25 октября 1917 г. // Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии: Документы и материалы. В 2 т. Т. 2. – Минск, 1957. – Док. № 16. – С. 30 – 31.

3. Телеграмма Главкомверха Н. В. Крыленко войсковым военно-революционным комитетам о ликвидации Ставки. 20 ноября 1917 г. // Там же. – Док. № 183. – С. 224.



Библиотека БГУИР

4. Отчет Облискомзапа председателю Совнаркома РСФСР В. И. Ленину об организации и упрочнении Советской власти в Западной власти. Апрель 1918 г. // Там же. – С. 932 – 937.

5. Усебеларускі з'езд 1917 года: сведчанне сучасніка // Беларускі гістарычны часопіс. – 1993. – № 1.

6. Первый Всебелорусский съезд в Минске. Декабрь 1917 г. // Нёман. – 1993. – №1.

Літаратура

Гісторыя Беларусі : падручнік. У 2 ч. Ч. 2: Люты 1917 – 2006 г. / Пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. – Мінск : Выш. шк., 2007. – С. 7 – 35 (спіс літаратуры на с. 97).

Новік, Я. К. Гісторыя Беларусі. Ад старажытных часоў – па 2008 г. : вучэб. дапам. / Я. К. Новік, І. Л. Качалаў, Н. Я. Новік. – Мінск : Выш. шк., 2009. – С. 281 – 296.

Ігнатоўскі, У. Кастрычнік на Беларусі / У. Ігнатоўскі. – Мінск, 1924.

Игнатенко, И. М. Октябрьская революция и самоопределение Белоруссии / И. М. Игнатенко. – Минск, 1992.

## 2-я заняткі

## Беларусь у перыяд грамадзянскай вайны і іншаземнай інтэрвенцыі. Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва

План

1. Пашырэнне нямецкай акупацыі Беларусі ў пачатку 1918 г. Брэсцкі мірны дагавор. Барацьба беларускага народа супраць нямецкіх акупантаў.
2. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР) ва ўмовах пашырэння нямецкай акупацыі.
3. Утварэнне Беларускай ССР. Пачатак станаўлення беларускай савецкай дзяржаўнасці.
4. Беларусь у перыяд польскай інтэрвенцыі. Барацьба беларускага народа супраць польскіх інтэрвентаў.

Прыкладныя тэмы рэфератаў:

1. Брэсцкі мірны дагавор у гістарычным лёсе беларускага народа.
2. Барацьба беларускага народа супраць нямецкіх акупантаў у 1918 г.
3. Пазіцыя бальшавікоў па нацыянальным пытанні.
4. Беларускі нацыянальны рух ва ўмовах польскай інтэрвенцыі.

### Пытанні і заданні для самападрыхтоўкі

1. Як і ў якіх умовах была абвешчана Беларуская Народная Рэспубліка?
2. З чым звязаны крызіс БНР? Як ён паўплываў на лёс рэспублікі і Беларускай сацыялістычнай грамады?



Библиотека БГУИР

3. Пакажыце палітычную барацьбу ў бальшавісцкай партыі напярэдадні ўтварэння БССР. Якія палітычныя сілы падрыхтавалі абвяшчэнне БССР?

4. Назавіце прычыны, якія прывялі да ўтварэння Літоўска-Беларускай ССР.

5. Чым характарызавалася жыццё Беларусі ва ўмовах польскай акупацыі?

6. Як адбылося другое абвяшчэнне БССР?

**Тэсты**

Выберыце правільны варыянт адказу

1. Тэрыторыя Беларусі ў 1918 г. атрымала назву «Заходняя камуна» па ініцыятыве:

а) А. Луцкевіча;
б) А. Мяснікова;
в) А. Чарвякова;
г) З. Жылуновіча.

2. Якія дзяржавы і калі падпісалі Брэсцкі мірны дагавор?

а) Польшча і Савецкая Расія, 18 сакавіка 1921 г.;
б) Германія і Савецкая Расія, 3 сакавіка 1918 г.;
в) Польшча і Германія, 9 лістапада 1919 г.

3. Калі была абвешчана Беларуская Народная Рэспубліка?

а) 21 лютага 1918 г.;
б) 9 сакавіка 1918 г.;
в) 25 сакавіка 1918 г.

4. Якая ўстаўная грамата абвяшчала БНР «незалежнай і вольнай дзяржавай»?

а) 1-я;
б) 2-я;
в) 3-я;
г) 4-я;
д) 5-я.

4. Якая падзея выклікала крызіс Рады БНР і крызіс Беларускай сацыялістычнай грамады?

а) прыняцце 3-й Устаўной граматы;
б) тэлеграма германскаму кайзеру;
в) рэвалюцыя ў Германіі;

5. Германскія войскі пакінулі частку Беларусі на ўсход ад р. Бярэзіны па дагавору ад:

а) 3 сакавіка 1918 г.;
б) 27 жніўня 1918 г.;
в) 9 лістапада 1918 г.;
г) 13 лістапада 1918 г.

Библиотека БГУИР

6. Дата абвяшчэння БССР:
а) 9 сакавіка 1918 г.;
б) 30 снежня 1918 г.;
в) 1 студзеня 1919 г.;
г) 3 лютага 1919 г.

7. Хто з палітычных дзеячаў стаяў ля вытокаў беларускай савецкай дзяржаўнасці?
а) А. і І. Луцкевічы;
б) Я. Варонка і І. Серада;
в) З. Жылуновіч і А. Чарвякоў.

8. Якая падзея адбылася 30 снежня 1918 г. у Смаленску?
а) І Усебеларускі з'езд;
б) VI Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РКП(б);
в) І Усебеларускі з'езд Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў.

9. Назавіце старшыню Часовага рэвалюцыйнага рабоча-сялянскага ўрада БССР:
а) А. Луцкевіч;
б) А. Мяснікоў;
в) А. Чарвякоў;
г) З. Жылуновіч.

10. Калі была створана Кампартыя Беларусі?
а) сакавік 1898 г.;
б) 1903 г.;
в) 1917 г.;
г) снежань 1918 г.

11. Калі была прынята першая беларуская савецкая Канстытуцыя?
а) 9 сакавіка 1918 г.;
б) 1 студзеня 1919 г.;
в) 3 лютага 1919 г.

12. Рашэнне аб стварэнні ЛітБел ССР было прынята на І Усебеларускім з'ездзе Саветаў у:
а) 1917 г.;
б) 1918 г.;
в) 1919 г.;
г) 1920 г.

Библиотека БГУИР

13. Якія дзяржавы і калі падпісалі Рыжскі мірны дагавор?
а) Германія і Савецкая Расія, 1918 г.;
б) Польшча і Савецкая Расія, 1921 г.;
в) Польшча і Беларусь, 1920 г.

14. Па ўмовах Рыжскага мірнага дагавору ў складзе БССР знаходзілася:
а) шэсць паветаў Мінскай губерні;
б) пяць заходніх губерняў былой Расійскай імперыі;
в) Магілёўская, Віцебская і Мінская губерні;
г) Гродзенская, Віленская і Мінская губерні.

15. Дата другога абвяшчэння БССР:
а) 12 ліпеня 1920 г.;
б) 31 ліпеня 1920 г.;
в) 30 снежня 1920 г.;
г) 12 ліпеня 1921 г.

Дакументы і матэрыялы:


1. Ленин, В. И. Социалистическое Отечество в опасности! 21 февраля 1918 г. / В. И. Ленин // Полн. собр. соч. – Т. 35. – С. 357 – 358.

2. Приказ главкомзапа А. Ф. Мясникова об организации обороны против немецких оккупантов на линии Витебск–Могилев–Гомель. 23 февраля 1918 г. // Из истории установления Советской власти в Белоруссии и образования БССР : Документы и материалы по истории Белоруссии. В 4 т. Т. 4. – Минск, 1954. – Док. № 519. – С. 382.

3. Сообщение о развертывании подпольной работы в оккупированном гор. Минске. 21 марта 1918 г. // Борьба за Советскую власть в Белоруссии. 1918 – 1920 гг.: сб. документов и материалов. В 2 т. Т. 1. – Минск, 1968. – Док. № 42. – С. 51.

4. Мірны дагавор... 3 сакавіка 1918 г. // Спадчына. – 1993. – № 2.

5. Дадатковы руска-германскі дагавор... 27 жніўня 1918 г. // Спадчына. 1993, № 3.

6. Устаўная грамата да народаў Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. – 1993. – №1.

7. Устаўная грамата Рады Беларускай Народнай Рэспублікі // Беларускі гістарычны часопіс. – 1993. – № 1.

8. Запись разговора И. В. Сталина с председателем Северо-западного областного комитета РКП(б) А. Ф. Мясниковым о государственном строительстве Белоруссии. 25 декабря 1918 г. // Борьба за советскую власть в Белоруссии. 1918 – 1920 гг.: сб. документов и материалов. В 2 т. Т. 1. – Минск, 1968. – Док. № 354. – С. 414 – 415.

9. Манифест Временного революционного рабоче-крестьянского правительства Белоруссии в связи с образованием Белорусской Советской


Библиотека БГУИР

Социалистической Республики. 1 января 1919 г. // Из истории установления Советской власти в Белоруссии и образования БССР: документы и материалы по истории Белоруссии. В 4 т. Т. 4. – Минск, 1954. – Док. № 620. – С. 447 – 449.

10. Из обращения I съезда Советов Белоруссии ко всем народам и признании самостоятельности Белоруссии и вступлении с ней в дипломатические отношения. 2 февраля 1919 г. // Там же. – Док. № 632. – С. 456 – 457.

11. Конституция Белорусской Советской Социалистической Республики, принятая на 1 съезде Советов Белоруссии. 3 февраля 1919 г. // Там же. – Док. № 633. – С. 457 – 460.

12. Декларация I съезда Советов Белоруссии об объединении Советских Социалистических Республик Литвы и Белоруссии. 16 февраля 1919 г. // Там же. – Док. № 637. – С. 462 – 463.

13. Телеграмма Совета обороны Литвы и Белоруссии об объединении военных сил советских республик. 31 мая 1919 г.// Образование СССР. 1917 – 1924 гг. : сб. документов. – М. – Л., 1949. – Док. № 6. – С. 125.

14. Декларация о провозглашении независимой Советской Социалистической Республики Белоруссии. 31 июля 1920 г. // Из истории гражданской войны в СССР: сб. документов и материалов. В 3 т. Т. 3. – М., 1961. – Док. № 273. – С. 319 – 321.

Літаратура

Гісторыя Беларусі : падручнік. У 2 ч. Ч. 2: Люты 1917 – 2006 г. / Пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. – Мінск : Выш. шк., 2007. – С. 35 – 97 (спіс літаратуры на с. 97).

Новік, Я. К. Гісторыя Беларусі. Ад старажытных часоў – па 2008 г. : вучэб. дапам. / Я. К. Новік, І. Л. Качалаў, Н. Я. Новік. – Мінск : Выш. шк., 2009. – С. 297 – 319.

Иностранная военная интервенция в Белоруссии. 1917–1920. – Минск, 1990.

Круталевич, В. А. История Беларуси: становление национальной государственности / В. А. Круталевич. – Минск, 1999.

Луцкевіч, А. Польская акупацыя ў Беларусі/ А. Луцкевіч// Беларусь. – 1990. – №9.

Платонов, Р. Тернистый путь к свободе: к вопросу о становлении белорусской национальной государственности / Р. Платонов, Н. Сташкевич // Неман. – 1992. – № 10, 11.

Библиотека БГУИР

## Тэма VI. Савецкая Беларусь ва ўмовах новай эканамічнай палітыкі і пабудовы сацыялізму: савецкая мадэль мадэрнізацыі. Заходняя Беларусь пад уладай Польшчы (1921 – 1939 гг.)

(4 гадзіны)

<u>1-я заняткі</u>

<u>Сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР у 1920 – 1930-я гады</u>

План

1. Новая эканамічная палітыка – яе сутнасць і змест. Вынікі аднаўлення народнай гаспадаркі БССР (1921 – 1928).
2. Сацыялістычная індустрыялізацыя ў Беларусі: яе характар, асаблівасці, шляхі правядзення.
3. Калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў Беларускай ССР. Эканамічныя і сацыяльныя вынікі рэфармавання сялянскіх гаспадарак.

Прыкладныя тэмы рэфератаў.

1. Асаблівасці правядзення новай эканамічнай палітыкі ў Беларусі.
2. Характар, мэты, цяжкасці сацыялістычнай індустрыялізацыі. Камандна-адміністрацыйныя метады кіравання.
3. Перадумовы і неабходнасць калектывізацыі сялянскіх гаспадарак. Выбар шляху і метадаў пераўтварэння вёскі.
4. Масавае сацыялістычнае спаборніцтва на Беларусі у гады першых пяцігодак. Стаханаўскі рух.

### Пытанні і заданні для самападрыхтоўкі

1. Ахарактарызуйце палітычнае, сацыяльна-эканамічнае становішча Беларусі пасля грамадзянскай вайны і замежнай інтэрвенцыі.
2. Назавіце эканамічныя і палітычныя прычыны ўвядзення новай эканамічнай палітыкі.
3. Раскрыйце эканамічныя і палітычныя мэты новай эканамічнай палітыкі, яе асноўныя мерапрыемствы.
4. Пакажыце асаблівасці і вынікі новай эканамічнай палітыкі на Беларусі.
5. У чым прычыны і гістарычнае значэнне ўваходжання БССР у склад СССР? Назавіце форму аб’яднання савецкіх рэспублік.
6. Якія змены адбыліся ў фінансава-грашовай сферы БССР у перыяд новай эканамічнай палітыкі? У чым сутнасць палітыкі «ножніцы цэн»?
7. Назавіце прычыны паступовага згортвання новай эканамічнай палітыкі на рубяжы 20 – 30-х гг. XX ст.
8. Калі ў СССР быў распрацаваны курс на сацыялістычную індустрыялізацыю? У чым неабходнасць яе правядзення?
9. Назавіце мэты і сродкі правядзення індустрыялізацыі ў СССР, прааналізуйце яе вынікі.

Библиотека БГУИР

10. У чым заключаліся асаблівасці правядзення індустрыялізацыі ў Беларускай ССР?

11. Пакажыце формы працоўнай актыўнасці рабочага класа і іх уплыў на развіццё эканомікі.

12. Якое становішча склалася ў сельскай гаспадарцы краіны напярэдадні калектывізацыі? У чым аб'ектыўная неабходнасць яе правядзення?

13. Ахарактарызуйце формы аб'яднання сялянскіх гаспадарак, пакажыце тэмпы і метады правядзення калектывізацыі.

14. Якія гістарычныя традыцыі ўлічваліся пры распрацоўцы палітыкі калектывізацыі сельскай гаспадаркі?

15. Чым абумоўлена суцэльная калектывізацыя беларускай вёскі, якімі былі яе вынікі?

16. Растлумачце прычыны рэпрэсіўных мер, якія праводзіліся ўладай да кулакоў падчас правядзення палітыкі суцэльнай калектывізацыі.

17. Якія перагібы і памылкі былі дапушчаны ў калгасным будаўніцтве? Чым яны былі абумоўлены?

18. Якімі былі вынікі калектывізацыі ў 1939 г.?

## Тэсты

Выберыце правільны варыянт адказу:

1. Назавіце галоўнае мерапрыемства нэпа ў галіне сельскай гаспадаркі:
а) здача зямлі сялянам у арэнду;
б) замена харчразвёрсткі харчовым падаткам;
в) свабода выбару формы арганізацыі апрацоўкі зямлі;
г) гарантыя землеўладання.

2. Якія віды гандлю ажыццяўляліся ў гады нэпа?
а) дзяржаўны, кааператыўны, прыватны;
б) кааператыўны, замежны, агульны;
в) прыватны, калгасны, унутраны;
г) прыватны, кааператыўны.

3. У 1921 г. для пераходу савецкай прамысловасці на гаспадарчы разлік былі створаны:
а) картэлі;
б) кааператывы;
в) трэсты.

4. Назавіце галіну прамысловасці, развіццё якой з'яўлялася асаблівасцю правядзення індустрыялізацыі ў БССР у 1920 – 1930-я гг.:
а) цяжкая;
б) хімічная;
в) лёгкая;
г) энергетычная.

Библиотека БГУИР

5. Якая палітыка Камуністычнай партыі і савецкага ўрада прадугледжвала стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы сацыялізму?

а) новая эканамічная палітыка;

б) сацыялістычная калектывізацыя;

в) сацыялістычная індустрыялізацыя;

г) электрыфікацыя.

6. На які перыяд часу быў распрацаваны першы пяцігадовы план развіцця гаспадаркі?

а) 1925/26 – 1929/30 гг.;

б) 1928/29 – 1932/33 гг.;

в) 1929/30 – 1933/34 гг.;

г) 1931/32 – 1934/35 гг.

7. Хто быў прыхільнікам свабоды выбару сялянамі формаў землекарыстання, насаджэння хутарскіх гаспадарак, а ў 1929 г. абвінавачаны ў правым ухіле і рэпрэсіраваны?

а) Дз. Прышчэпаў;

б) А. Баліцкі;

в) М. Галадзед;

г) А. Чарвякоў.

8. Дзе ў БССР пачала дзейнічаць першая МТС?

а) у Вілейцы;

б) Койданаве (Дзяржынск);

в) Уздзе;

г) Смалявічах.

9. Калі была адкрыта першая ў рэспубліцы авіялінія Мінск – Масква?

а) 1924 г.;

б) 1925 г.;

в) 1935 г.;

г) да рэвалюцыі 1917 года.

Дакументы і матэрыялы:

1. Резолюция V съезда КП(б)Б. Минск. 15 – 20 октября 1921 г. «Экономическое положение Белоруссии и новая экономическая политика» // КПБ в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. В 14 т. Т. 1 (1918 – 1927). – Минск, 1983. – С. 89 – 94.

2. Из резолюции по отчету ЦК XII съезду КП(б)Б. 5 – 16 февраля 1929 г. // Там же. Т. 2 (1928 – 1932). – Минск, 1984. – С. 80 – 95.

Библиотека БГУИР

3. Резолюция пленума ЦККП(б)Б 3 – 18 февраля 1930 г. «О сплошной коллективизации сельского хозяйства БССР и проведении сельскохозяйственной компании в 1930 г.» // Там же. Т. 2 (1928 – 1932). – Минск, 1984. – С. 192 – 202.

Літаратура

Гісторыя Беларусі : падручнік. У 2 ч. Ч. 2: Люты 1917 – 2006 г. / Пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. – Мінск : Выш. шк., 2007. – С. 99 – 127 (спіс літаратуры на с. 196).

Новік, Я. К. Гісторыя Беларусі. Ад старажытных часоў – па 2008 г. : вучэб. дапам. / Я. К. Новік, І. Л. Качалаў, Н. Я. Новік. – Мінск : Выш. шк., 2009. – С. 321 – 338.

Актуальныя пытанні гісторыі БССР. Савецкі перыяд. – Мінск, 1991. – С. 36–104.

Григорьев, Г. П. Крестьянские общества взаимопомощи БССР: 1921 – 1930 гг. / Г. П. Григорьев. – Минск, 1993.

Мікуля, Я. НЭП і калгаснае будаўніцтва ў Беларусі 1921 – 1925 гг. / Я. Мікуля // Весці АН БССР, серыя грамадскіх навук. – 1990. – №6.

Страницы истории компартии Белоруссии: суждения, аргументы, факты. – Минск, 1990. – С. 96 – 136.

## 2-я заняткі
## Грамадска-палітычнае жыццё.
## Культурнае будаўніцтва ў Беларусі

План

1. Нацыянальная палітыка ў БССР. Беларусізацыя і яе ўплыў на духоўнае адраджэнне беларускай нацыі ў 1920-я гг.
2. Асаблівасці адміністрацыйнай і палітычнай сістэмы беларускага савецкага грамадства. Умацаванне аднапартыйнай сістэмы. Канстытуцыя БССР 1937 г.
3. Культурная рэвалюцыя ў Беларускай ССР: сутнасць, дасягненні і вынікі.

Прыкладныя тэмы рэфератаў:

1. Канфесіянальная палітыка ў 1920 – 1930-я гады ў Беларусі.
2. Змагары за нацыянальнае адраджэнне (У. Ігнатоўскі, Я. Лёсік, М. Гарэцкі, У. Галубок, А. Дудар, М. Чачот, П. Галавач і інш.).
3. Развіццё агульнаадукацыйнай школы ў Беларусі ў 1920 – 1930-я гг.
4. Вышэйшая школа ў Беларусі.
5. Дзейнасць літаратурных аб'яднанняў «Маладняк», «Узвышша», «Полымя» і іх роля ў працэсе фарміравання новага сацыялістычнага грамадства.
6. Станаўленне і развіццё нацыянальнага тэатральнага і музычнага мастацтва Беларусі.



Библиотека БГУИР

## Пытанні і заданні для самападрыхтоўкі

1. Якія змены адбыліся ў адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле БССР у 20 – 30-я гг. XX ст.?

2. Ахарактарызуйце палітычную сістэму беларускага грамадства ў канцы 1930-х гг. Чым яна адрознівалася ад палітычнай сістэмы пачатку 1920-х гг.?

3. Роля Камуністычнай партыі, Саветаў і іншых грамадскіх арганізацый у палітычным жыцці Беларусі ў 20 – 30-я гг. XX ст.

4. Раскрыйце змест палітыкі беларусізацыі. Калі яна праводзілася? Якімі былі яе вынікі?

5. Вызначце асаблівасці нацыянальнай структуры беларускага грамадства у 20 – 30-я гг. XX ст.

6. Ахарактарызуйце канфесійную палітыку ў БССР у 20 – 30-я гг. XX ст. Якімі былі яе вынікі?

7. Назавіце прычыны палітычных рэпрэсій, іх маштаб і вынікі.

8. Чым выклікана гістарычная неабходнасць культурнага будаўніцтва ў краіне?

9. Як адбывалася ліквідацыя непісьменнасці і малапісьменнасці дарослага насельніцтва рэспублікі?

10. Якія асноўныя напрамкі развіцця асветы і навукі былі на Беларусі ў 20 – 30-я гг. XX ст.?

11. Назавіце асноўныя накірункі развіцця беларускай літаратуры, тэатральнага, музычнага мастацтва.

12. Якія дасягненні меліся ў развіцці жывапісу, скульптуры і архітэктуры Беларусі ў 20 – 30-я гг. XX ст.?

13. Назавіце характэрныя рысы савецкага сацыялістычнага грамадства.

## Тэсты

Выберыце правільны варыянт адказу

1. На Усесаюзным з’ездзе Саветаў 30 снежня 1922 г. быў прыняты дагавор аб стварэнні СССР. Якія рэспублікі з’явіліся першымі яго стваральнікамі?

а) БССР, РСФСР, УССР;
б) РСФСР, ЗСФСР;
в) БССР, РСФСР, УССР, ЗСФСР;
г) БССР, УССР, ЗСФСР.

2. Калі адбылося першае і другое ўзбуйненне тэрыторыі БССР?

а) 1924, 1926 гг.;
б) 1925, 1926 гг.;
в) 1926, 1927 гг.;
г) 1938, 1939 гг.

Библиотека БГУИР

3. Якія мовы мелі статус дзяржаўных у БССР у час беларусізацыі?
а) беларуская, руская, яўрэйская, польская;
б) руская, беларуская;
в) яўрэйская, беларуская, літоўская;
г) беларуская, украінская, літоўская.

4. Камісію ЦВК БССР па ажыццяўленні палітыкі беларусізацыі ўзначальваў:
а) У. М. Ігнатоўскі;
б) А. Л. Бурбіс;
в) А. І. Хацкевіч.

5. Назавіце беларускага гісторыка і грамадскага дзеяча, народнага камісара асветы БССР, старшыню Інбелкульта, першага прэзідэнта Беларускай акадэміі навук:
а) У. Пічэта;
б) М. Доўнар-Запольскі;
в) А. Баліцкі;
г) У. Ігнатоўскі.

6. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт быў адкрыты:
а) у 1919 г.;
б) у 1921 г.;
в) у 1927 г.

7. Назавіце псеўданім, якім карыстаўся І. Луцэвіч:
а) Янка Купала;
б) Янка Лучына;
в) Мацей Бурачок;
г) Якуб Колас.

8. Дзе працаваў першы беларускі дзяржаўны тэатр пад кіраўніцтвам першага ў БССР заслужанага артыста Е. Міровіча?
а) у Мінску;
б) Віцебску;
в) Гомелі;
г) Магілёве.

9. У якім годзе быў створаны на базе дзяржаўнай опернай студыі Беларускі тэатр оперы і балета?
а) 1932 г.;
б) 1933 г.;
в) 1937 г.;
г) 1946 г.


Библиотека БГУИР

10. Дзе знаходзіўся цэнтр падрыхтоўкі мастацкіх кадраў Савецкай Беларусі ў 1920-я гг.?

а) Мінская мастацкая выстаўка;

б) Віцебскі мастацкі тэхнікум;

в) Магілёўскае мастацкае вучылішча;

г) Інбелкульт.

11. Калі адбыўся I з’езд пісьменнікаў Беларусі, які аформіў Саюз пісьменнікаў БССР?

а) 1930 г.;

б) 1934 г.;

в) 1936 г.;

г) 1938 г.

12. Калі адбылася рэарганізацыя Інбелкульта ў Беларускую акадэмію навук (з 1936 г. – АН БССР)?

а) 1922 г.;

б) 1927 г.;

в) 1929 г.;

г) 1932 г.

Дакументы і матэрыялы:

1. Из резолюции объединительного Пленума ЦК и ЦКК КП(б)Б «Об очередных задачах культурного строительства в БССР» 22 – 27 июля 1926 г. // КПБ в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. В 14 т. Т. 1 (1918 – 1927). – Минск, 1983. – С. 338 – 345.

2. Из резолюции XI съезда КП(б)Б «Об итогах национально-культурного строительства и политико-просветительской работы к десятилетию Октябрьской революции» 22–29 ноября 1927 г. // Там же. Т. 1 (1918 – 1927). – С. 504 – 514.

3. Хрэстаматыя па гісторыі беларускага тэатра і драматургіі. У 2 т. Т. 1. – Мінск, 1975. – С. 29 – 38, 39 – 40, 149 – 158.

Літаратура

Гісторыя Беларусі : падручнік. У 2 ч. Ч. 2: Люты 1917 – 2006 г. / Пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. – Мінск : Выш. шк., 2007. – С. 128 – 179 (спіс літаратуры на с. 196 – 197).

Новік, Я. К. Гісторыя Беларусі. Ад старажытных часоў – па 2008 г. : вучэб. дапам. / Я. К. Новік, І. Л. Качалаў, Н. Я. Новік. – Мінск : Выш. шк., 2009. – С. 338 – 355

Архитектура Советской Белоруссии. – М., 1986. – С. 23 – 45.

Беларазовіч, В. Асаблівасці калектывізацыі ў заходніх абласцях БССР у 1939 – 1941 гг. / В. Беларазовіч // Беларускі гістарычны часопіс. – 1999. – №1. – С. 37 – 44.



Библиотека БГУИР

Гісторыя беларускага мастацтва. У 6 т. Т. 4. – Мінск, 1990. – С. 47 – 62, 181 – 199.

Канфесіі на Беларусі. (XVIII – XIX ст.). – Мінск, 1998. – С. 155 – 216.

Народная адукацыя і педагагічная навука ў Беларусі (1917 – 1945 гг.). – Мінск, 1993.

Страницы истории компартии Белоруссии: суждения, аргументы, факты. – Минск, 1990. – С. 136 – 199.

## Тэма VIII. * Сацыяльна-эканамічнае, палітычнае і культурнае развіццё Беларускай ССР. Замежныя сувязі (1945 – 1990 гг.)

(4 гадзіны)

1-я заняткі.
Сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР у 1945 – 1990 гг.

План

1. Аднаўленне народнай гаспадаркі Беларусі пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны.
2. Спробы рэфармавання савецкай эканомікі ў 50 – 60 гг. XX ст. Прычыны няўдач рэформ.
3. Фарміраванне навукова-прамысловага комплексу Беларусі ў 1970-х гг. – 1990 г.: поспехі і праблемы. Супярэчнасці сацыяльнага развіцця.

Прыкладныя тэмы рэфератаў:

1. Жыццё і дзейнасць П. М. Машэрава.
2. Роля навукі ў развіцці прамысловай вытворчасці БССР у 1960 – пачатку 1980-х гг.
3. Станаўленне радыётэхнічнай і электроннай прамысловасці на Беларусі.
4. Аграрны комплекс Беларусі.
5. Месца і роля БССР у агульнасаюзным народнагаспадарчым комплексе.
6. Роля і месца БССР на міжнароднай арэне ў перыяд канфрантацыі дзвюх грамадска-палітычных сістэм у другой палове 40-х – першай палове 80-х гг. XX ст.

### Пытанні і заданні для самападрыхтоўкі

1. Ахарактарызуйце стан эканомікі Беларусі пасля Вялікай Айчыннай вайны. Асноўныя задачы 4-й пяцігодкі.
2. Растлумачце сутнасць змен у эканоміцы СССР у 1950-я гг. У чым яны праявіліся ў Беларускай ССР?
3. Што назвалі эканамічнай рэформай 1960-х гг. і як яна праводзілася ў БССР?

* Нумарацыя тэм адпавядае [31]

4. Пакажыце, як нарошчваўся эканамічны патэнцыял краіны ў 1970-я – першай палове 1980-х гг. Прывядзіце факты з развіцця БССР.

5. Растлумачце, якія праблемы ўзніклі ў 1970 – 1980-я гг. у сацыяльна-эканамічным і палітычным развіцці СССР?

**Тэсты**

Выберыце правільны варыянт адказу

1. Назавіце страты, якія Беларусь панесла ў гады Вялікай Айчыннай вайны (у даваенных цэнах):

а) 95 млрд. р.;

б) 75 млрд. р.;

в) 742 млн р.

2. Якія першапачатковыя мэты стаялі перад гаспадаркай БССР у 1944 – 1945 гг.?

а) аднаўленне прамысловасці, якая вырабляе тавары народнага спажывання;

б) аднаўленне работы галін прамысловасці, важкіх для арміі;

в) запаўненне рынку таварамі, ліквідацыя дэфіцыту тавараў народнага спажывання;

г) аднаўленне работы транспарту для задавальнення патрэб арміі.

3. Аднаўленне эканомікі БССР пачалося з:

а) восені 1943 г.;

б) вясны 1944 г.;

в) лета 1944 г.;

г) вясны 1945 г.

4. Якая пяцігодка з'яўляецца пяцігодкай аднаўлення народнай гаспадаркі?

а) 3-я;

б) 4-я;

в) 5-я.

5. Якая галіна вытворчасці стала вызначаць накіраванасць прамысловасці Беларусі ў пасляваенныя гады?

а) лёгкая;

б) харчовая;

в) машынабудаванне і металаапрацоўка;

г) лясная;

д) хімічная.

6. Асноўную дапамогу ў аднаўленні гаспадаркі БССР аказалі:

а) краіны Захаду праз ААН;

Библиотека БГУИР

б) народы разгромленых краін – Германіі, Італіі і г.д.
в) іншыя рэспублікі СССР праз бюджэт СССР;
г) гаспадарка БССР аднаўлялася за кошт рэспубліканскіх унутраных рэзерваў.

7. У якім годзе ўступілі ў строй і выдалі першую прадукцыю аўтамабільны і трактарны заводы ў Мінску?
а) 1946 г.;
б) 1950 г.;
в) 1952 г.;
г) 1956 г.

8. Калі адбылося пераўтварэнне Савета Народных Камісараў СССР у Савет Міністраў СССР, а саўнаркамаў саюзных рэспублік адпаведна ў Саветы Міністраў саюзных рэспублік?
а) 1945 г.;
б) 1946 г.;
в) 1950 г.;
г) 1952 г.

9. Аб'ём прадукцыі прамысловасці ў БССР перавысіў даваенны ўзровень у:
а) 1947 г;
б) 1948 г.;
в) 1950 г.;
г) 1952 г.;
д) 1955 г.

10. Калі адбылося пераўтварэнне БССР з аграрна-індустрыяльнай у індустрыяльную рэспубліку?
а) у 1930-я гг.;
б) у 1940-я гг.;
в) у 1950 – 1960-я гг.;
г) у 1970 – 1980-я гг.

11. Ліпеньскі (1955 г.) Пленум ЦК КПСС узяў курс на:
а) індустрыялізацыю;
б) паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу;
в) правядзенне эканамічнай рэформы.

12. Калі ў СССР існавала тэрытарыяльная сістэма кіравання эканомікай – саўнаргасы?
а) 1920 – 1930-я гг.;
б) 1940 – 1950-я гг.;
в) канец 1950 – пачатак 1960-х гг.;
г) канец 1960 – пачатак 1970-х гг.

Библиотека БГУИР

13. Які пленум ЦК КПСС прыняў рашэнне аб правядзенні эканамічнай рэформы?

а) ліпеньскі 1955 г.;
б) кастрычніцкі 1964 г.;
в) сакавіцкі 1965 г.;
г) вераснёўскі 1965 г.

14. Калі Беларусь па колькасці насельніцтва выйшла на даваенны ўзровень?

а) 1950 г.;
б) 1965 г.;
в) 1974 г.;
г) 1981 г.

15. Калі ўвайшла ў строй першая чарга Мінскага метрапалітэна?

а) 1974 г.;
б) 1984 г.;
в) 1987 г.

Дакументы і матэрыялы:

1. Из основных показателей экономического и социального развития БССР за период 1965 – 1981 гг. // Хрестоматия по истории БССР. 1917 – 1983. – Минск, 1984. – С. 352.
2. Развитие промышленности БССР в 1971 – 1975 гг. // Хрестоматия по истории БССР. 1917 – 1983. – С. 367 – 368.
3. Из сообщения «Сельской газеты»: «Золотой Меркурий» прописывается в Минске. 16 октября 1980 г.// Хрестоматия по истории БССР. 1917 – 1983. – С. 375 – 376.
4. Производство важнейших видов продукции в БССР, 1981 г. // Хрестоматия по истории БССР. 1917 – 1983. – С. 380.
5. Валовая продукция сельского хозяйства по пятилеткам в среднем за год // Хрестоматия по истории БССР. 1917 – 1983. – С. 397.
6. Народное хозяйство Белорусской ССР в 1985 г.: стат. ежегодник. – Минск, 1986.
7. Мазуров, К. Воспоминания, выступления, интервью/ К. Мазуров. – Минск, 1999.

Літаратура

Гісторыя Беларусі : падручнік. У 2 ч. Ч. 2: Люты 1917 – 2006 г. / Пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. – Мінск : Выш. шк., 2007. – С. 257 – 289, 311 – 332 (спіс літаратуры на с. 335).

Новік, Я. К. Гісторыя Беларусі. Ад старажытных часоў – па 2008 г. :



Библиотека БГУИР

вучэб. дапам. / Я. К. Новік, І. Л. Качалаў, Н. Я. Новік. – Мінск : Выш. шк., 2009. – С. 427 – 432, 436 – 441, 443 – 450.

Белорусская ССР: Статус, достижения, развитие. – Минск, 1989.

Гиоргидзе, З. И., Геращенко, Л. Ф. Белоруссия за десять пятилеток / З. И. Гиоргидзе, Л. Ф. Геращенко. – Минск, 1982.

Жытко, А. П., Фамін, П. Н. Гісторыя Беларусі (1945 – 2002 гг.): вучэб. дапаможнік/ А. П. Жытко, П. Н. Фамін. – Мінск, 2005.

История рабочего класса Белорусской ССР. В 4 т. Т. 4. – Минск, 1987.

Наука и техника Советской Белоруссии в 1917–1990 гг.: Хроника важнейших событий. – Минск, 1991.

Смирнов, Ю. Жизнь и слава Петра Мироновича / Ю. Смирнов // Беларуская думка. – 1993. – № 2.

Эканамічная гісторыя Беларусі : вуч. дапам. / пад рэд. В. І. Галубовіча. 3-е выд., дап. і перапрац. – Мінск, 1999. – С. 341 – 400.

## 2-я заняткі.
## Культурнае жыццё Беларусі ў 1945 – 1990 гг.

План

1. Узрастанне ролі адукацыі і навукі ў жыцці грамадства.
2. Развіццё беларускай літаратуры і мастацтва ў 1950-х – першай палове 1980-х гг.

Прыкладныя тэмы рэфератаў:

1. Творчасць выдатных дзеячаў культуры (З. Азгур, М. Савіцкі і інш.).
2. Вышэйшая адукацыя на Беларусі ў 1950-х – першай палове 1980-х гг.
3. Гісторыя ўтварэння і развіцця МРТІ – БДУІР.
4. Выдатныя вучоныя Беларусі.
5. Развіццё архітэктуры ў 1950-х – першай палове 1980-х гг.
6. Беларуская музычная культура.
7. Асаблівасці развіцця беларускага тэатра ў 1950-х – першай палове 1980-х гг.

**Тэсты**

Выберыце правільны варыянт адказу

1. Калі была ўведзена ўсеагульная сярэдняя адукацыя?
а) у 1950-я гг.;
б) у 1960-я гг.;
в) у 1970-я гг.;
г) у 1980-я гг.

2. Дата адкрыцця МРТІ (БДУІР):
а) 1961 г.;
б) 1964 г.;

Библиотека БГУИР

в) 1968 г.;
г) 1970 г.

3. Хто з названых асоб не займаў пасаду прэзідэнта АН БССР?
а) А. Р. Жэбрак;
б) Б. І. Сцяпанаў;
в) В. Ф. Купрэвіч;
г) М. А. Барысевіч.

4. Якія фактары перашкаджалі хуткаму развіццю беларускай культуры пасля вайны?
а) звужэнне сферы прымянення беларускай мовы;
б) недастатковы доступ да вышэйшай адукацыі ў рэспубліцы;
в) астатковы прынцып фінансавання адукацыі і культуры;
г) адсутнасць увагі да пытанняў развіцця культуры з боку кампартыі.

5. Стваральнікам беларускай школы балета лічыцца:
а) Я. Цікоцкі;
б) А. Пятроў;
в) У. Алоўнікаў;
г) В. Елізар'еў.

Літаратура

Гісторыя Беларусі : падручнік. У 2 ч. Ч. 2: Люты 1917 – 2006 г. / Пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. – Мінск : Выш. шк., 2007. – С. 289 – 311 (спіс літаратуры на с. 335).

Новік, Я. К. Гісторыя Беларусі. Ад старажытных часоў – па 2008 г. : вучэб. дапам. / Я. К. Новік, І. Л. Качалаў, Н. Я. Новік. – Мінск : Выш. шк., 2009. – С. 450 – 456.

Архітэктура Беларусі : энцыкл. даведнік. – Мінск, 1993.

Гісторыя беларускага мастацтва. У 6 т. Т. 5.– Мінск, 1992; Т. 6. – Мінск, 1994.

Супярэчлівасць культурнага жыцця Беларусі ў сярэдзіне 50-х – сярэдзіне 80-х гг. // Беларускі гістарычны часопіс. – 1993. – № 2.

Библиотека БГУИР

## Тэма IX. Рэспубліка Беларусь на шляху станаўлення і ўмацавання дзяржаўнага суверэнітэту (1991 – 2011 гг.)

(2 гадзіны)

Абвяшчэнне незалежнасці Рэспублікі Беларусь і яе грамадска-палітычнае жыццё на мяжы XX – XXI стст.

План

1. Дзяржаўны пераварот у Маскве ў жніўні 1991 г. Абвяшчэнне незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

2. Прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і выбранне першага Прэзідэнта краіны. Рэспубліканскі рэферэндум 14 мая 1995 г.

3. Першы Усебеларускі народны сход. Рэспубліканскі рэферэндум 24 лістапада 1996 г.

4. Другі, трэці і чацвёрты Усебеларускія народныя сходы. Рэспубліканскі рэферэндум 17 кастрычніка 2004 г. Выбранне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 19 снежня 2010 г.

Прыкладныя тэмы рэфератаў:

1. 1990 г. – пераломны і лёсавызначальны год у гісторыі Савецкай дзяржавы. Якія падзеі адбыліся ў гэтым годзе?
2. Падзеі 19 – 21 жніўня 1991 г. у Маскве: розныя ацэнкі і меркаванні.
3. Ліквідацыя СССР: розныя погляды і меркаванні.
4. Усебеларускія народныя сходы – новая і вышэйшая форма дэмакратыі, волевыяўлення беларускага народа.
5. Беларуская апазіцыя, формы і метады яе барацьбы за ўладу.
6. Умяшальніцтва ЗША і краін Еўрасаюза ва ўнутраныя справы Рэспублікі Беларусь.

### Пытанні і заданні для самападрыхтоўкі

1. Чаму 1990 г. з'яўляецца пераломным у гісторыі Савецкай дзяржавы? Якія лёсавызначальныя падзеі адбыліся ў гэтым годзе?

2. 27 ліпеня 1990 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце рэспублікі ў складзе Савецкай федэрацыі. Што азначала фраза «ў складзе Савецкай федэрацыі»?

3. Як вы ацэньваеце палітычную пазіцыю Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Прэзідэнта СССР М. С. Гарбачова ў падзеях 19 – 21 жніўня 1991 г. у Маскве (у час здзяйснення дзяржаўнага перавароту)?

4. Як ацэньваюць падзеі ў Маскве 19 – 21 жніўня 1991 г. гісторыкі, палітыкі, публіцысты?

5. З якога часу наша краіна называлася «Беларуская ССР»? З якога часу наша краіна называецца «Рэспубліка Беларусь»?



Библиотека БГУИР

6. Якія герб і сцяг сталі дзяржаўнымі сімваламі Рэспублікі Беларусь у 1991 г.?

7. Як ацэньваюць ліквідацыю СССР гісторыкі, палітыкі, публіцысты?

8. Якія, на ваш погляд, прычыны краху савецкага дзяржаўнага і грамадскага ладу?

9. Чаму герб «Пагоня» і бела-чырвона-белы сцяг на рэферэндуме 1995 г. не былі прызнаны народам нацыянальнымі дзяржаўнымі сімваламі?

10. Якія пытанні былі вынесены на рэспубліканскі рэферэндум 24 лістапада 1996 г.?

11. Як змянілася структура органаў дзяржаўнай улады і кіравання ў адпаведнасці з новай рэдакцыяй Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г.?

12. Чаму на рэферэндуме 1996 г. было вырашана перанесці Дзень незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дзень рэспублікі) з 27 ліпеня на 3 ліпеня?

13. Як (і чаму іменна так) было вырашана на рэферэндуме 1996 г. пытанне аб куплі-продажу зямель сельскагаспадарчага прызначэння?

14. Якую ролю адыгралі Усебеларускія народныя сходы ў дзейнасці беларускай дзяржавы і жыцці беларускага народа?

15. 19 снежня 2010 г. адбыліся выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Якія палітычныя сілы ўнутры краіны і за яе межамі зрабілі няўдалую спробу здзейсніць дзяржаўны пераварот у Рэспубліцы Беларусь? Якую пазіцыю ў сувязі з падзеямі 19 снежня 2010 г. у Мінску занялі кіраўнікі ЗША і краін Еўрасаюза? Чаму іменна такую пазіцыю яны занялі?

## Тэсты

Выберыце правільны варыянт адказу

1. У якім годзе ў СССР быў здзейснены дзяржаўны пераварот і забаронена дзейнасць КПСС і КПБ?

а) у 1993 г.;
б) у 1991 г.;
в) у 1989 г.;
г) у 1995 г.

2. У якім годзе Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь адмяніў сваю памылковую пастанову аб часовым прыпыненні дзейнасці КПСС – КПБ і дазволіў існаванне ўсіх яе структур і органаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь?

а) у 1991 г.;
б) у 1992 г.;
в) у 1993 г.;
г) у 1994 г.

3. З якога часу Беларуская ССР стала звацца Рэспублікай Беларусь?

а) з 15 снежня 1991 г.;
б) з 19 верасня 1991 г.;

Библиотека БГУИР

в) з 27 ліпеня 1991 г.;
г) з 10 студзеня 1991 г.

4. Калі быў дэнансаваны дагавор 1922 г. аб утварэнні СССР і дзе гэта адбылося?
а) 10 кастрычніка 1991 г. у Віцебску;
б) 15 лістапада 1991 г. у Гродне;
в) 8 снежня 1991 г. у Віскулях Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці.

5. Назавіце прозвішчы кіраўнікоў Беларусі, Расіі і Украіны, якія паставілі свае подпісы пад дакументам аб дэнансацыі дагавора 1922 г. аб утварэнні СССР:
а) Ельцын, Шушкевіч, Краўчук;
б) Пуцін, Кебіч, Юшчанка;
в) Ельцын, Кучма, Чыгір.

6. Калі была прынята новая Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь?
а) 10 лістапада 1993 г.;
б) 23 снежня 1993 г.;
в) 15 студзеня 1994 г.;
г) 15 сакавіка 1994 г.

7. Калі была прынята на рэспубліканскіх рэферэндумах Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 г. (са змяненнямі і дапаўненнямі)?
а) 20 мая 1995 г.;
б) 24 лістапада 1996 г.;
в) 17 кастрычніка 2004 г.;
г) 3 жніўня 1998 г.

8. Калі адбыўся першы Усебеларускі народны сход?
а) 20 – 21 мая 1996 г.;
б) 6 – 7 ліпеня 1996 г.;
в) 19 – 20 кастрычніка 1996 г.;
г) 4 – 7 лютага 1997 г.

9. Калі адбыўся другі Усебеларускі народны сход?
а) 16 кастрычніка 2001 г.;
б) 30 верасня 2003 г.;
в) 3 лютага 2004 г.;
г) 18 мая 2001 г.

10. Калі адбыўся трэці Усебеларускі народны сход?
а) 14 – 15 студзеня 2006 г.;
б) 2 – 3 сакавіка 2006 г.;

Библиотека БГУИР

